ие. Другім аружжам ёсьць **байкот консумэнтаў**. Ад фірмаў, пастаўленых на індэксе, работніцкая кляса нічога ня купляе. Гэты байкот робіцца паважным і дасягае мэты найбольш там, дзе істнуюць работніцкія і агульныя коопэратывы, або дзе дзякуючы прытарнаваньню прафэсіянальнымі саюзамі фабрычнай маркі „label“ творацца спэцыяльныя „лігі консумэнтаў“, якія солідарна выступаюць у абароне працы. Марка „label“ знайшла шырокае прытарнаваньне; і сёньня коопэратывы набываюць толькі тавар з гэтай маркай, байкатуючы тавары фабрык, якія не заслужылі на „label“.

Арганізацыям работнікаў процістаўляюцца арганізацыі фабрыкантаў, якія на забастоўку работнікаў адказываюць лёкаўтам (lokaut).

Найлепш зарганізаваны прафэсіянальныя саюзы ў Аўстраліі і Новай Зэляндыі. Там работнікі жадалі чатырох васьмёрак: 8 гадзін працы, 8 сну, 8 адпачынку і 8 шылінгаў платы.

---

Работніцкая кляса, злучаная ў прафэсіянальныя таварыствы, выступаючы ў характары прадуцэнтаў праз спажывецкую коопэрацыю, паступова пераймае ў свае рукі бег гаспадарчага жыцьця, а перш за ўсё: а) нават пад панаваньнем прыватнага капіталу ўнармоўвае варункі свае працы; б) ствapae сілу, якая можа рабіць націск на ўладу і самаўрады і надаваць кірунак грамадзкай палітыцы; в) злучаная ў спажывецкія саюзы, выключае гандлёвае пасрэдніцтва і бярэ пэўныя вытворчыя прадпрыемствы ў свае рукі; г) ператварае паступова сыстэму панаваньня капіталу над працай.

Цяперашняе разьвіцьцё ідэі коопэратыўных інстытуцыяў, як і прафэсіянальных таварыстваў пацьвярджае гэтыя надзеі. Коопэратары стварылі многамільёныя саюзы спажыўцоў, адсоўваючы эксплёатацыю капіталістычнага гандлю і накіданьне сабе дарагіх і сфальшаваных тавараў, а прафэсіянальныя саюзы нармуюць ацносіны паміж капіталам і працай.

---

4-ая ЧАСЬЦЬ.

# ГІСТОРЫЯ ГРАМАДЗКАЙ ЭКАНОМІІ.

## I. Эканамічныя доктрыны.

### § 72. Старадаўнасьць.

Гісторыя навукі эканомікі неразрыўна зьвязана з гісторыяй грамадзкай гаспадаркі. У розных фазах гэтага разьвіцьця тварыліся розныя эканамічныя погляды, зьместам якіх былі заўважаньні, апёртыя на жыцьцёвай практыцы данай эпохі. Аднак агульныя паняцьці, абнімаючыя ўсе бакі гаспадарчых зьявішчаў у суцэльную навуковую сыстэму, маглі вытварацца толькі тады, калі гаспадарчыя чыннасьці выйшлі з граніц дому і занялі ў зборным жыцьці паважнае месца. Дзеля гэтага-ж ужо старадаўнасьць і сярэднія вякі мелі адпаведных обсэрватараў гаспадарчых зьявішчаў сярод розных народаў. Гэтыя заўважаньні, хаця ня твораць сыстэматычнай цэласьці і не заслугоўваюць на назову ўмеласьці, зьяўляюцца цікавымі, — бо выказваюць дух розных эпохаў сярод розных народаў. Людзкі розум толькі пад уплывам вялікага інтэлектуальнага руху ў XVIII ст. ўзнёсься да паняцьця грамадзянства як цэласьці і захацеў адкрыць яго сэнс, разьвіцьцё і законы, якія кіруюць ім. На так прыгатаваным грунце паўстала грамадзкая эканомія, як асобная навука, абыймаючая ўсе бакі эканамічна-грамадзкіх зьявішчаў.

Старадаўнасьць, а дык і Грэкі, якія ў старадаўняй культуры былі правадырамі, не патрапілі дайсьці да веды, абнімаючай гаспадарча-грамадзкія зьявішчы ў іх суцэльнасьці, ў іх арганічнай сувязі, а старадаўнія аўторы толькі мімаходам аб'ясьнялі некаторыя гаспадарчыя пытаньні. Навуковыя дасьледы гэтых зьявішчаў былі ім чужыя. Нічога ў гэтым дзіўнага, бо дзяржава галоўную сваю мэту бачыла ў рэлігійных і мілітарных пытаньнях; вялі тады пераважна натуральную гаспадарку, замкнутую, а праца пераважна была пакінута нявольнікам, а затым была мала цэнена. Пра-

мысловасьць лічылі за такі занятак, які быў не да твару вольным мужом (грамадзянам), якія толькі дбалі аб валасных і дзяржаўных справах, займаліся філёзофіяй і гімнастыкаваліся ў ваенных муштрах. Гаспадарчыя асновы і пагляды старадаўнасьці заключаюцца часткова ў рэлігійных і дзяржаўных уставах, часткова ў творах філёзофаў, гісторыкаў і дзяржаўных мужоў. З гэтых пагляд аў трэба ад'значыць права Майсея, якое заключала ў сабе многа гаспадарчых асноваў, а перш за ўсё такіх, што датычылі аграрнага законадаўства, якое імкнулася да таго, каб забясьпечыць дзяржаве сільны сярэдні земляробскі стан і, у меру магчымасьці, не дапускаць вялікай няроўнасьці ўладаньня і абядненьня шырокіх масаў (паўпэрызму). Рымская (corpus juris civilis) права ўсталяе найважнейшыя гаспадарчыя паняцьці (дабро, вартасьць, грошы, капітал, крэдыт, уласнасьць, даход і інш.). З праўнага пункту гледжаньня, а ў далейшым разьвіцьці рымскае права выказала вялікі ўплыў на паўстаньне і разьвіцьцё вялікага ліку гаспадарчых установаў, аб чым сьведчыць гісторыя.

З Грэцкіх пісьменьнікаў **Ксэнофонт** (430 — 356 п. Хр.) знае дзейнікі вытворства: прыроду і працу, паняцьце гаспадарчага дабра і падзелу працы.

Найвышэй ставіць земляробства, ніжэй рукадзельле і гандаль. У сваіх поглядах на нявольніцтва Ксэнофонт ня выходзе з рамак свайго сталецьця.

**Плятон** (429—348 п. Хр.) прызнае карысьці й значэньне гандлю й звароту. У сваім творы: „Рэспубліка“ прадстаўляе ідэальную дзяржаву, у якой дзеліць насяленьне на тры клясы: пануючую, ваяўнікоў і паспаліты народ, прыймаючы пры гэтым супольнасьць гаспадарчага дабра. Ідэальная дзяржава Плятона ёсьць узорам для ўсіх пазьнейшых ідэальных помыслаў грамадзкіх і дзяржаўных.

**Арыстотэль** (384—322 г. п. Хр.) трактуе навуку аб гаспадарчым дабры, як памоцную ўмеласьць да свае „Этыкі“; разрозьнівае ўжытковае і абаротнае дабро, гаспадарку натуральную і грашовую. Зьяўляецца праціўнікам процантаў ад пазык. Што да нявольніцтва, дык вядомым ёсьць яго сказ, што калі цытры самі сабой будуць зьвінець (іграць), а чаўнок пры ткацкім варстаце сам будзе працаваць, нявольніцтва станецца непатрэбным.

## § 73. Сярэднія вякі.

Доўга, бо тысячу гадоў з лішкаю, цягнулася сярэднявечная эпоха і пераказала нам яшчэ меншыя здабычы з галіны эканамічнага дасьледу й пісьменнасьці. Гэтая эпоха зьяўляецца нібы доўгім памостам між сьветам клясычнай



старадаўнасьці а новачаснымі грамадзянствамі. Выпірае яна паступова з гаспадарчага жыцьця тыя формы быту, якія станавілі аснаўныя характарнасьці (азнакі) нявольнічага ладу, уводзе на іх месца новыя, зьмененыя дарогай эвалюцыі і вышаўшыя з даўнейшых формы, становячыя вяшчаваньне грамадзкага ладу новажытных часоў. Месца нявольніцтва заняў у сярэдніх вякох г. наз. **фэодальна-цэхавы лад**. Даўнейшых нявольнікаў у земляробскай гаспадарцы заступілі падданыя, або мужыкі (сяляне), якія былі прыкуты да зямлі: не маглі яны тэй зямлі, таго грунту, на якім „сядзелі“, тэй вёскі, у якой жылі, сваявольна пакідаць, але ўсё жыцьцё мусілі сядзець на гэным грунце, вытвараючы цяжкай сваей працай усялякае дабро, неабходнае для задаваленьня людзкіх патрэбаў. Пераважную часьць свае працы падданыя мусілі аддаваць сваім панам, на якіх карысьць адраблялі гэт. зван. паншчыну (працавалі на панскім), якім, апрача таго, складалі часьць пладоў свае працы. Мужык ня быў фармальна нявольнікам пана, рыцара, шляхціца, графа, барона або князя, але быў фактычна нявольнікам, бо яго жыцьцё было ў руках фэодальнага пана, а прадуктамі свае працы мусіў задавольваць ўсе патрэбы свайго пана. Арыстокрацыя, або паны, займаліся вайной, поэзіяй, ганаровымі справамі, турнэямі, маючы ў пагардзе ўсялякую працу земляробную, прамысловую і гандлёвую. Прамысловасьць і гандаль узялі ў свае рукі месты, якія аднак таксама мусілі плаціць фэодальным паном вялікія даніны. У гарадох маюць сваё селішча рамесьленыя цэхі. Цэхі зьяўляюцца замкнутымі эканамічнымі арганізацыямі, да якіх доступ агранічаны і ўтруднены, якія ў сваіх руках зьбіраюць усялякія галіны прамысловага вытворства, недапушчаючы конкурэнцыі з боку няцэхавай прадукцыі. Прымацаваньню мужыкоў да зямлі ў земляробстве адказвае прымацаваньню рамесьленьнікаў да цесных рамак цэхавых арганізацыяў у прамысловым вытворстве. Недапушчаючы конкурэнцыі, цэхі перашкаджалі поступу прамысловасьці, утрымліваючы яе ў застоі.

З другога боку земляробства вытварала столькі прадуктаў, колькі было патрэбна пану і падданым. Ня было купцоў на прамысловыя вытвары. Рынак збыту для рамесьленьніка быў вельмі абмяжаваны, і ня выходзіў за вал гораду, у якім мясьціўся цэх.

---

Сярэднявяковая эканамічная літаратура яшчэ бяднейшая за стараклясычную, бо спачывала чуць ня выключна толькі ў руках айцоў касьцёла і касьцельных пісьменьнікаў, а гэтых мала абходзіла справа матэр'яльнага дабра, а больш духовага дабра (моральнага). Іх навукі скарэй трактуюць

аб марнасьці сьвецкага дабра і пагардзе для яго і больш зьвяртаюць увагу на асновы рэлігійна-абычайныя. Прапагуюць любоў бліжняга, дабрачыннасьць, скасаваньне нявольніцтва, забараняюць браць проценты ад пазыкаў, ганяць раскіднасьць і г. д.

Наогул касьцельныя пісьменнікі сярэдніх вякоў стаяць на грунце асноў тагочаснага ладу. Усе станы павінны прытарнавацца сваю жыцьцёвую норму да свайго становішча ў грамадзкай герархіі і ня імкнуцца на вышэйшыя ступені грамадзкай драбіны. Супольнасьць уласнасьці і ўжываньня айцы касьцёла лічылі за натуральнае права, за ідэал грамадзкага ладу. Гэтую супольнасьць фактычна ўвялі хрысьціянскія злучнасьці (воласьці) ў першых вяках нашае эры. З эканамічных пытаньняў, сярэднавечныя пісьменьнікі цікавяцца, галоўным чынам, справай гаспадарчых заняткаў (на першым месцы ставяць земляробства й рамясло), справядлівых цэнаў, таксаў на тавары, спэкуляцыяй і процантамі.

Толькі пад канец сярэдніх вякоў пачынае сільней разьвівацца эканамічнае жыцьцё.

У гэтым часе пачынаюць паўставаць выразьнейшыя эканамічныя доктрыны і эканамічныя школы, маючыя вялікі ўплыў на гаспадарчае жыцьцё свае эпохі і вялікае гістарычнае значэньне.

**Пад эканамічнай доктрынай разумеем навуковы кірунак, які дасьледжвае толькі некаторыя праявы гаспадарчых зьявішчаў. Эканамічнай школай называем навуковы кірунак, які дасьледжвае суцэльнасьць гаспадарчых зьявішчаў.**

# II. Эканамічныя школы.

## Новыя часы.

### § 74. Мэркантылізм.

З адкрыцьця Амэрыкі найбольш скарыстала Гішпанія, якая пачала ўзбагачвацца, дзякуючы капальням золата. Відзячы гэта, іншыя Эўропэйскія дзяржавы пачалі думаць над тым, якім спосабам зраўняцца з Гішпаніяй. Усюды разумелі, што золата ёсьць багацьцем гаспадарства. Дзяржавы, нямаючыя сваіх капальняў золата, пачалі шукаць іншых дарог для атрымліваньня добрародных мэталяў. Да гэтай мэты скіравалі ўсю палітыку дзяржавы (Англія, Францыя, Італія) і пачалі думаць аб спосабах справаджаньня



золата да краю. Популярнымі былі думкі аб зьбіраньні золата шляхам замежнага гандлю. Дзеля гэтага стараліся вывязьці якнайбольшы лік тавараў заграніцу, каб узамен атрымаць і прывесьці да краю золата, апрача таго ставілі ўсялякія перашкоды справаджваньню тавараў з заграніцы, з тэй мэтай, каб не выдаваць золата з краю. Гэтая палітыка называлася імкненьнем да стварэньня **„карыснага гандлёвага балянсу“**; у сваім часе прычынілася яна да разьвіцьця краёвай прамысловасьці.

Эканамічная палітыка і погляды тагачасных эканамістых на справы нацыянальнага багацьця былі падданы аналізу пазьней і асталіся ахрышчанымі Адамам Смісам **„мэркантылізмам“.** *)

Погляды мэркантылістых можна абняць такімі пунктамі:

1. Чым больш у краі ёсьць добрародных мэталяў (золата, серабро), тым ёсьць ён багацейшы; зьбіраць мэталі можна, маючы свае капальні або пры помачы заграгічнага гандлю.

2. Заграгічны гандаль, ведзены ўласнымі сіламі нацыі, дае больш заработкаў, чым ведзены чужаземнымі сіламі.

3. Гандлёвы балянс павінен быць актыўным.

4. Вывазіць могуць толькі тыя краі, якія шмат прадукуюць. Многа прадукаваць тавараў могуць краі, маючыя густое насяленьне, сырыя матар'ялы, добрую комунікацыю. Дарогай дзяржаўных распараджэньняў край павінен аблягчаць прывоз сырых матар'ялаў і аблягчаць вываз гатовых фабрыкатоў.

Інтэрвэнцыя гаспадарства патрэбна: павінна яно, пры помачы ўзброенай сілы, абараняць граніцы, надбіваць новыя рынкі куплі сырых матар'ялаў і рынкі збыту гатовых тавараў, павінна будаваць сухія і водныя сродкі комунікацыі, устанаўляць мытныя тарыфы, сваім прадпрыемнікам вызначаць тавары, якія яны павінны выробляць і на‘т вызначаць месца, дзе пэўная фабрыка павінна быць пабудавана.

Эканамістымі, якія баранілі мэркантыльную доктрыну, былі, у Англіі Бакон, І. Лоў і шмат іншых, у Францыі — Montchrétien і інш. Найвыдатнейшымі прадстаўнікамі мэркантыльнай палітыкі былі: францускі міністар Кольбэр і ангельскі — Кромвэль. Кольбэр, міністар Людвіка XIV, сыстэматычна тарнаваў цэлы рад сродкаў, вёўшых да разьвіцьця ў Францыі прамысловасьці, да павялічэньня збыту францускіх тавараў заграніцу і да аграгічэньня прывозу да краю чужаземных тавараў. Закладаў на кошт дзяржавы фабрыкі, выдаваў прадпрыемствам авансы, прывілеі і прэміі,

*) У немцаў назвалі камэралізмам.

справаджваў з заграніцы спэцыялістых — рамесьнікаў і работнікаў, спыняў цэховыя прывілеі, якія перашкаджалі разьвіцьцю прамысловасьці, устанаўляў высокае мыта на замежныя тавары, каб утрудніць конкурэнцыю чужых тавараў на францускіх рынках. Кольбэр разьвіў таксама гандлёвы флёт у Францыі і гандаль з заморскімі краямі.

Такой самай палітыкі трымаўся ў Англіі Кромвэль, які ў 1651 г. выдаў шырока вядомы **навігацыйны акт**, забараняючы чужым караблём перавозіць тавары між Англіяй і контынэнтальнымі краямі, або ангельскімі калёніямі, а таксама абложыў высокім мытам тавары, прывожаныя чужымі купцамі ў Англію.

Аснаўным прынцыпам мэркантыльнай сыстэмы была **дзяржаўная рэглямэнтацыя** (абмежаваньне), дзяржаўная апека над гаспадарчым жыцьцём, якая выразілася ў цэлай масе распараджэньняў, інструкцыяў, загадаў і забаронаў, маючых на мэце зьбіраньне добрародных мэталяў у краі, разьвіцьцё прамысловасьці і гандлю, дасягненьне актыўнага гандлёвага балянсу.

З часам аднак мэркантыльная сыстэма аджыла сваё, бо пачала перашкаджаць далейшаму разьвіцьцю эканамічнага жыцьця ў краёх, якія яе тарнавалі. У некаторых краёх хаця і накладалі высокае мыта на замежныя тавары, але не стараліся разьвіваць краёвай прамысловасьці. У зьвязку з гэтым дзяржаўны скарб атрымліваў з мыта даходы, але насяленьне мусіла дорага плаціць за чужыя тавары, бо краёвых тавараў—часамі неабходных — ня было зусім з прычыны слабога разьвіцьця свайго вытворства. Узноў у многіх краёх дзяржаўны ўладар, хочучы мець як найбольш грошай, фальшаваў монэту, што ў рэзультаце вельмі блага адбівалася на дабрабыце падданых, падрывала загранічны гандаль і разбурала ўсё эканамічнае жыцьцё краю. Пазьней апрача мэркантыльнай сыстэмы, якую ўвялі дзяржавы адносна да іншых краёў, асобныя провінцыі данай дзяржавы пачалі прытарноўваць протэкцыянізм між сабой. Пэўныя провінцыі або гарады, напр. францускія, адгароджваліся кітайскім мурам высокага мыта ад іншых провінцыяў Францыі, утрудняючы вольны гандаль унутры краю. Дзяржава надзялілася на рад замкнутых гаспадарскіх ладаў, перашкаджаючых шырокаму разьвіцьцю народнай гаспадаркі. Тымчасам назьбіраны ўжо капітал — як у Францыі, Англіі — ня зносе ніякіх путаў і абмяжоўваньняў. З натуры свае ён няўдзячны, скора забываецца, што мэркантыльная сыстэма прычынілася да награмаджэньня яго, пачынае бунтавацца проціў мэркантыльнай палітыкі; дамагаецца скасаваньня ўсялякай рэглямэнтацыі ўраду, адкідвае ўсялякую далейшую дзяржаўную апеку, бо ўжо сам чуецца на сілах перамагчы ўсялякія перашкоды, замінаючыя яго разьвіцьцю;



дамагаецца вольнасьці гандлю, дамагаецца скасаваньня цэхавага ладу, ўрэшце дамагаецца вольнасьці працы, або аканчальнага скасаваньня падданства. Гэтая апошняя „вольнасьць" неабходна патрэбна для разросту прамысловасьці, а гэта галоўным чынам дзела таго, што пры падданстве ў месьце трудна было знайсьці таннага работніка. Падданыя ня мелі права пакідаць вясковы загон і пераносіцца ў места, дзе капіталістыя хацелі даць ім працу ў сваіх мануфактурах.

## § 75. Школа фізыякратаў.

У палавіне XVIII ст. паўстае першая школа эканамістых, якая пачала крытыкаваць мэркантыльную сыстэму. Мэркантылізм стварыў шмат штучных, бо накінутых уладай, агранічэньняў, якія перашкаджалі далейшаму вольнаму разьвіцьцю капіталізму. Школа фізыякратаў імкнецца да скасаваньня ўсіх штучных агранічэньняў і загадаў, якія выдаюцца ёй ненатуральнымі; дамагаецца астаўленьня эканамічнага жыцьця яго натуральнаму бегу; імкнецца да ўвядзеньня поўнай вольнасьці ў гаспадарчых адносінах; дамагаецца, каб дзяржава зусім ня ўмешвалася ў эканамічнае жыцьцё, каб не апекавалася ім, каб яму ані памагала ані перашкаджала, і тады яно само рэзаўецца найляпей. Гэтая школа атрымала назоў школы фізыякратаў, што таксама ўжо характарызуе яе (physis — натура, kratos—улада: улада натуры). Консэквэнцыяй імкненьняў фізыякратаў было цьвярджэньне фізыякратаў, што адно толькі земляробства (і горная прамысловасьць) зьяўляецца вытворчай галінай гаспадарчага жыцьця, а праца прамысловая і гандлёвая не ствapae нічога новага, перарабляе толькі тое, што вытварыла земляробства. Дзеля гэтага дзяржава павінна зьвярнуць увагу на земляробства, а прамысловасьць і гандаль пакінуць на волю сваей долі, перастаць імі цікавіцца. Рэзультатам гэтакага разумаваньня было дамаганьне фізыякратоў, выказанае па адрэсе дзяржавы: „laissez faire, laissez passer"—пазвольце дзеяць, пазвольце праходзіць. Гэтая тэза была на руку як для прамысловасьці, так і для земляробства. Гэта было выгадным для прамысловасьці з тэй прычыны, што ўзрастаючае капіталістычнае вытворства (машыновае, фабрычнае) вымагала толькі вольнасьці (вольнасьці гандлю, вольнасьці працы) і скасаваньня ўсялякіх агранічэньняў і загадаў (цэхаў, мыта, падданства); а для земляробства, — дзеля таго, што закіненае пры мэркантыльнай сыстэме, — яно патрабавала помачы і апекі дзяржавы.

Фізыякраты змагаюцца з поглядамі мэркантылістых, што багацьце народу залежыць выключна ад ліку золата і серабра ў краі; займаюцца высьненьнем эканамічных пы-

таньняў, як падзел грамадзянства на клясы, разьмеркаваньне грамадзкага даходу, падзел працы, вартасьць, грошы, падаткі, заработкі, проценты, чысты даход з зямлі. У сувязі з гэтым кірунак гэты можа быць ужо названы эканамічнай школай, тады, як кірунак мэркантылістычны астаўся толькі доктрынай, якая займалася бягучымі пытаньнямі эканамічнае палітыкі.

Тварцом школы фізыякратаў быў Кароль Кэнэ (Charles Quesnay) — прыдворны доктар Людвіка XV ў Францыі.

Кэнэ ў сваім творы „Tableau economique“ ілюструе зварот эканамічнага дабра ў грамадзянстве. Дзеліць ён увесь народ на 3 клясы: земляўласьнікаў, арэндатараў і рамесьленьнікаў. Кляса арэндатараў штогод кладзе ў зямлю 3 мільярды ў форме насеньня, навозаў, працы, пыладаў і атрымлівае з зямлі 5 мільярдаў у форме земляробскіх прадуктаў.

Лішка (прыбытак)—2 мільярды ёсьць чыстым даходам, дарам прыроды, які атрымліваюць зямельныя ўласьнікі ў форме арэнды. Зямельныя ўласьнікі аддаюць 1 мільярд рамесьленнай клясе за купленыя ў іх рэчы, за другі мільярд купляюць земляробскія прадукты ад арэндатараў. Рамесьленьнікі атрымліваюць адзін мільярд ад уласьнікаў, другі ад арэндатараў — узамен за свае вытвараныя рэчы і абодва мільярды аддаюць арэндатарам за сыр'ё і пажывеньне. Такім чынам, абегшы ўсе клясы, грошы варочаюцца да арэндатараў, якія іх узноў укладаюць у зямлю.

Рамесьленьнікаў, гандляроў і г. п. фізыякраты называюць клясай непрадукцыйнай (sterile), бо паводле іх пры перапворчай прадукцыі не паўстае ніякая вартасьць: вартасьць вытвараных прадметаў складаецца з вартасьці сырых матар'ялаў і коштаў утрыманьня выробніка падчас яго працы. Ападаткаваць трэба толькі клясу зямельных уласьнікаў, якая атрымлівае цэлы чысты даход (2 мільярды „produit net“); фізыякраты дамагаюцца ўвядзеньня „import unique“ (падатку), абцяжваючага ўласьнікаў. Прадстаўнікамі фізыякратаў былі: К. Кэнэ, Тюрго, Мірабо і іншыя.

## § 76. Лібэральная школа.

Тварцом гэтае школы называнай клясычнай, або ангельскай, або лібэральнай быў Адам Сміс (A. Smith), прафэсар Глазгоўскага Унівэрсытэту, які ў сваім творы „Студыі над прыродай і прычынамі нацыянальнага багацьця“ (1776 год.) першы стварыў навуковую сыстэму палітычнае эканоміі. Паводле Сміса пабуджэньнем да гаспадарчай дзейнасьці чалавека ёсьць асабісты інтэрас, якім кожны кіруецца ў гаспадарчым жыцьці, а грамадзянствам кіруюць натуральныя (прыродныя) законы, якіх людзі ня могуць зьмяніць, нават каб хацелі, бо не ад іх яны залежаць; каб нават людзі і маглі зьмяніць іх, то ў гэтай перамене ня меліб ніякага інтарэсу (карысьці).



Зразуменьне асабістага інтарэсу не перародзіцца ў эгоізм, бо гэтаму перашкаджае страх перад такою самаю адплатаю з боку іншых. У гаспадарчых адносінах павінна панаваць вольнасьць, а тады наступіць роўнамернае разьмеркаваньне грамадзкага даходу, бо кожны ў грамадзянстве атрымае столькі, сколькі сам запрацаваў; вольная конкурэнцыя будзе нівэляваць розьніцы ў заработках і даходах. Такім чынам, вольнасьць у гаспадарчых адносінах і вольная конкурэнцыя створаць грамадзкую гармонію.

Ангельская школа прызнае працу за аснову багацьця як адзінкі, так і народу, а дзеля гэтага праца павінна быць вольнай і з'арганізаванай. Вольнасьць працы палягае на вольнасьці кожнага ў выбары сабе занятку і на вольным пераходзе ад адной працы да другой, гаспадарства (ўрад) не павінна мяшацца ў гэту справу. Арганізацыя працы будзе палягаць на падзеле працы, па спэцыялізацыі, якая вельмі павялічыць прадукцыйнасьць яе; падзел працы павінен быць ня толькі мясцовы, але і міжнародны. Міжнародны падзел працы мае апірацца на тым, што кожны народ будзе займацца толькі такой працай, якая найбольш адказвае краёвым варункам. Да гэтых варункаў належаць географічнае палажэньне данага краю, натуральныя багацьці, якасьць зямлі, клімат і інш. Той край, які мае добрую зямлю і адпаведны клімат, будзе займацца земляробствам; край, што мае каменны вугаль і капальныя багацьці, будзе займацца мэталюргічнай прамысловасьцю; край, які мае добрыя сродкі комунікацыі і адпаведнае географічнае палажэньне, будзе займацца гандлем і транспортам і г. д. Такі падзел працы створыць тое, што прадукты і тавары будуць выробляцца найтанейшым спосабам, на чым кожны народ толькі выйграе, бо вольная конкурэнцыя будзе інстытуцыяй, якая стане рэгуляваць цэны на тавары пры міжнародным звароце.

У сыстэме натуральнай вольнасьці дзяржава мае спаўняць тры абавязкі: абараняць край ад непрыяцеляў, забясьпечыць бесстаронтасьць судоў і ўтрымліваць грамадзкія ўстановы, якія ня могуць аплаціцца адзінкам, або ўтрыманьне іх перавышае сілы асобных людзей.

Стоячы на грунце эканамічнай вольнасьці, Адам Сміс аднак прызнаваў патрэбу некаторых абмежаваньняў і стаяў за паступовы пераход да вольнасьці. Прызнае ён абмежаваньні ў мэтах: абароны краю, выраўнаньня варункаў прадукцыі краёвай і закардоннай (мыта) і рэпрэсіі за благое трактаваньне краёвых тавараў заграніцай.

Наступнікі Адама Сміса І. Б. Сэй, Д. Рыкардо, Р. Мальтус, І. Мілль, Джэмс і інш. комэнтавалі і крытыкавалі навуку А. Сміса.

**Д. Рыкардо і Робэрт Мальтус** належаць да пэсымістычнага кірунку лібэральнае школы. Пэсымізм іх асноўваўся на тым, што калі Сміс прадбачыў, што пры сыстэме вольнае конкурэнцыі наступіць справядлівае разьмеркаваньне грамадзкага даходу,—то пэсымістыя цьвярдзілі, што прыродныя дзейнікі замуцяць роўны падзел даходу і ня зусім будзе дасягнута грамадзкая гармонія, бо разьмеркаваньне грамадзкага даходу не адбываецца прапарцыянальна да ўложанай працы.

Робэрт Мальтус (XVIII—XIX) падаў тэорыю аб узросьце насяленьня. Чалавецтва ўзрастае ў геомэтрычнай прогрэсіі, а вытворства спажывецкіх прадуктаў узрастае ў арытмэтычнай прогрэсіі. Гэта знача, што калі насяленьне ўзрастае як 2, 4, 16, 32 то вытворства прадуктаў узрастае як 2, 4, 6, 8. Такім чынам, насяленьне ўзрастае шмат скарэй і дзеля таго мусіць наступіць такі час, калі ня хваце прадуктаў, калі наступіць барацьба між людзьмі...

У сваей тэорыі Мальтус памінуў узрост культуры і цывілізацыі. Краі з вышэйшаю культураю маюць натуральны прырост (людзей) вельмі малы, тады калі народы нізкай культуры натуральны прырост маюць шмат большы. Апрача таго, Мальтус ня ведаў яшчэ аб поступе тэхнікі прадукцыі і вынаходах у хіміі, якія пазваляюць шмат павялічыць ураджайнасьць зямлі.

Давід Рыкардо (XVIII — XIX), аўтор твору „Асновы палітычнае экономіі і спадаткаваньня“ сформуляваў тэорыю зямельнай рэнты. Паводле Рыкардо, дзякуючы ўзросту насяленьня, узрастае патрабаваньне на збожжа, што вядзе за сабой займаньне пад ральлю штораз то горшай зямлі. Збожжа, атрыманае з горшай зямлі, каштуе даражэй, дзеля гэтага цана на збожжа зьбіранае са ўсіх грунтаў даражэе, і таму ўласьнікі лепшай зямлі пры прадажы збожжа атрымліваюць дарма даход — рэнту. Ад узросту цэн на збожжа багацеюць уласьнікі зямлі, пры адначасным абядненьні работнікаў, якія змушаны купляць штораз то даражэйшы хлеб. Заработная плата работнікаў, якую Рыкардо называе „натуральнай“, трымаецца заўсёды на роўні коштаў утрыманьня работніка; дзякуючы посулу работніцкіх рук і патрабаваньня на іх, „номінальная“ плата, г. ё. сума грошай атрымліваная работнікам мусіць заўсёды імкнуцца да натуральнай платы.

Школа клясычная ў экономіі мела вялікае значэньне. Усыстэматызавала яна прадмет дасьледу, аддзяліла тэорыю экономіі ад эканамічнай палітыкі, падняла значэньне працы і старалася адкінуць ад прамысловасьці і гандлю рэглямэнцыю дзяржавы.



## § 77. Манчэстэрская школа.

Кірунак практычны, эканамічная палітыка, праводзячая ў жыцьцё асновы лібэральнай школы, называецца Манчэстэрскай школай. Манчэстэрская школа імкнулася да скасаваньня агранічэньняў гандлю, якія былі ўведзены пасьля як перастала істнаваць эканамічная блёкада Англіі, абяўленая Напалеонам. Дзякуючы блёкадзе (1806 г.) ў Англіі добра направілася земляробства, бо давоз эўропэйскага збожжа быў Напалеонам забаронены, а на контынэнце пасьля ўстрыманьня давозу колёніяльных тавараў, сільна падняласся прадукцыя цукровых буракоў. Скасаваньне блёкады выклікала крызыс на збожжа ў Англіі і на цукер на контынэнце, а дзеля таго гаспадарствы ўвялі абароннае мыта. Англія ўвяла ў 1815 і 1828 г. мыта на збожжа; мытная стаўка была рухомая, павялічвалася калі збожжа таньнела і зьмяншалася ў выпадку даражэньня. У 1836 г. ў Лёндане і ў 1838 г. ў Манчэстэры закладваюцца таварыствы для барацьбы з мытам на збожжа. У 1839 г. таварыствы лучацца ў адну лігу і пачынаюць далей вясці барацьбу з мытам у Парлямэнце і прэсе. Ініцыятарам гэтага руху быў **Рычард Кобдэн**, з якім разам працаваў І. Брайт, Робэрт Пэль і іншыя. Дзякуючы энэргічнай працы Лігі, ў 1846 г. мыта на збожжа было скасавана. Далейшая праца Лігі была ў духу эканамічнага лібэралізму. Р. Кобдэн прыймае чынны (дзейны) ўдзел у падпісаньні гандлёвага трактату з Францыяй у 1860 г. Дзеячы манчэстэрскай школы бралі ўдзел у акцыі аб паляпшэньні палажэньня работнікаў; гэтая школа мела вялікі ўплыў на грамадзкае і скарбовае законадаўства ў Англіі, а таксама і на контынэнце Эўропы; значэньне яе змалела каля 1870 г.

## § 78. Нацыянальная школа.

Нацыянальная школа гэта — кірунак навуковы, трактуючы нацыянальную гаспадарку як асобную суцэльнасьць, пакліканую да ўсебаковага разьвіцьця сваіх эканамічных сілаў і вызначаючы дзяржаве кіруючую ролю ў выгадоўваньні і падтрыманьні іх. Школа гэта выступае процiў прынцыпу „laissez faire, laissez passer“, а наадварот зьяўляецца прыхільніцай дзяржаўнай інтэрвэнцыі і ўвядзеньня мыта.

Лібэральныя тэорыі Адама Сміса былі доказам ангельскіх інтарэсаў і эгоізму. Міжнародны падзел працы, вольнасьць гандлю могуць быць зьдзейсьнены ў варунках аднолькавае гаспадарчае сілы і аднолькавае ступені разьвіцьця ўсіх народаў, а ў праціўным выпадку сільнейшыя народы будуць эканамічна ціснуць слабейшых, што ўжо мела

месца, і дзеля таго выклікала рэакцыю проціў лібэралізму. У краёх, якім была цяжкаю эканамічная перавага ўпрамыслоўленай Англіі, пачынаюць паяўляцца галасы, што разьвіцьцё кожнага краю залежыць ад цэлага раду дзейнікаў: прыродных варункоў, геаграфічнага палажэньня, стану камунікацыі і інш., а дзеля таго ня можна прыняць адной эканамічнай палітыкі для ўсіх народаў, толькі кожнаму трэба пакінуць індывідуальны, нічым не абмяжованы, поступ наперад.

Чым краі больш мае прамысловасьці, тым зьяўляецца багацейшым за іншыя краі; найбяднейшым краем зьяўляецца той, які займаецца толькі сельскай гаспадаркай. У выпадку вайны, краі фабрычны патрапіць лепей вясьці яе.

Нацыянальная школа паказвае на неабходнасьць упрамыслаўленьня краю з пагляду на эканамічныя, грамадзкія і палітычныя карысьці. Для таго каб падняць у краі фабрычнае вытворства, дзяржава павінна ўводзіць мыта на чужыя тавары, якія будуць прыходзіць на ўнутраны рынак.

Галоўнымі прадстаўнікі гэтае школы былі: А. Мюллер, Ф. Ліст і Г. Кэрэй.

**Адам Мюллер** (1809 г.) бачыць аналёгію паміж дзяржавай і чалавекам. Як чалавек імкнецца да роўнамернага разьвіцьця усіх часьцей свайго арганізму, так і дзяржаўны арганізм павінен імкнуцца да разьвіцьця ўсіх яго функцыяў, а дзяліць функцыі паміж народамі ня можна. Спадчына пакаленьняў сільна сплятае цяперашняе, мінулае і будучае кожнага народу.

**Фрыдрых Ліст**, спачатку прыхільнік Адама Сміса, пазнаёміўшыся аднак у часе палітычнай эміграцыі (з Нямеччыны) з нацыянальным кірункам амэрыканскай эканоміі, робіцца прыхільнікам яе поглядаў і, пасьля павароту ў Нямеччыну, выдае ў 1841 г. сваю „Нацыянальную сыстэму палітычнай эканоміі“. Паводле Ліста, кожны народ мусіць прайсьці этапы гаспадарчага жыцьця: стан дзікасьці, паляваньня, пастухоўства, земляробства, прамысловасьці, земляробна-прамыслова-гандлёвы, але ня кожны народ праходзе іх у тым самым часе, а затым эканамічная вольнасьць выклікала-бы падбіцьцё слабейшых краёў, якія стаяць на ніжэйшай ступені разьвіцьця. Эканамічная палітыка павінна быць выказам (вынікам) гаспадарчых патрэбаў народу. Ф. Ліст быў прыхільнікам увядзеньня мытнай тарыфы, пад яго ўплывам была заключана мытная унія ў Нямеччыне.

**Гэнрых Кэрэй**, амэрыканскі эканамісты, прыхільнік оптымістычнага кірунку клясычнай школы, у сваім творы, „Прошласьць, цяперашнасьць і будучына“ (1848 г.) крытыкуе тэорыю Рыкардо аб пераходзе ад лепшай зямлі да горшай, што вядзе за сабой зямельную рэнту.



Паводле Кэрэя, людзі перш займалі зямлю горшую, а пасьля лепшую, затым тэорыя Рыкардо памылкова вясьсьняе паўстаньне рэнты.

У грамадзянстве Г. Кэрэй бачыць імкненьне да асоцыяцыі, цераразьмернаму цэнтралізму процістаўляецца закон „адпіханьня“, дзеля гэтага не паўстаюць вельмі вялікія людзкія натоўпы; стаіць ён за самастойнае разьвіцьцё найлепшых натоўпаў—народаў; з увагі на тое што асоцыяцыя залежыць ад мены ўслуг, гандаль, як зьмяншаючы яе інтэнсыўнасьць, павінен быць скасаваны. Пазьней ідэі Кэрэя былі прыняты солідарызмам.

## § 79. Псыхолёгічная або Аўстрыяцкая школа.

Псыхолёгічную школу называюць таксама Аўстрыяцкай, бо паўстала па ініцыятыве прафэсара Венскага Унівэрсытэту К. Мэнгэра. Розьніцца яна ад лібэральнай школы тым, што калі, паводле лібэральнае школы, адзіным мотывам людзкога дзеяньня меў быць матар'яльны інтэрас адзінкі, то псыхолёгічная школа цьвердзіць, што мы гаспадарым для задавальваньня ўсіх нашых патрэбаў, з якіх найважнейшая ёсьць тая, якая ў даны момэнт і ў данай адзінцы з найбольшай выступае сілай. У зьвязку з гэтым, у меру палажэньня і фактычнага псыхічнага настрою, прычыны моральныя, грамадзкія, альтруістычныя, або якія-небудзь іншыя могуць пераважваць матар'яльны інтэрас. Пры дасьледзе сутнасьці гаспадарчых зьявішчаў трэба апірацца на распазнаньні ўсіх псыхолёгічных мотываў нашай дзейнасьці.

Псыхолёгічную мэтоду дасьледу прытарнаваў Мэнгэр і яго школа да тэорыі вартасьці і цаны, а Бом-Бавэрк пашырыў яе на тэорыю даходу з капіталу. Тэорыя вартасьці апіраецца на паняцьці крайняй пажытковасьці. Апрача таго цьвердзіць, што калі запас рэчаў павялічваецца, то крайняя пажытковасьць гэтых рэчаў зьмяншаецца таксама з тэй прычыны, што натуга нашага пажаданьня зьмяншаецца ў меру большай магчымасьці задавольваньня нашай патрэбы. Чалавек лічыць вартаснай толькі такую рэч, якой уладаньне яму патрэбна для задаваленьня патрэбы. Рэчы вольныя, хаця і пажытковыя, ня маюць для нас вартасьці. Вартасьць прадметаў, якія самай працай можам вольна памнажаць, ацэньваем паводле нашага інтарэсу зьберэганьня сабе працы ў параўнаньні з пажыткам прадмету. Вартасьць такіх прадметаў залежыць ад ступені людзкога пажаданьня, густу і заможнасьці людзей і ад рэдкасьці прадметаў.

Паводле гэтай тэорыі прадметы (рэчы), якія задавальваюць пільнейшыя патрэбы, маюць большую вартасьць чым

рэчы якія маюць задаволіць менш пільныя (борздыя) патрэбы (патрэбы пазьнейшыя ў часе). З гэтага Бом-Бавэрк выводзе сваю тэорыю аб даходах з капіталу, тлумачачы іх тым, што капіталісты аддае свае капіталы на пэўны час, затым, пасьля ўплыву гэтага часу, павінен атрымаць зварот сваіх капіталаў з лішкаю, якая выраўнівае розьніцу між цяперашняй вартасьцю капіталу і яго вартасьцю ў часе пазьнейшым. Істнуючае дабро цэніцца больш як дабро, якое яшчэ мае ў будычыне паўстаць.

Да псыхолёгічнай школы належаць: К. Мэнгэр, Бом-Бавэрк, Маршаль і інш.

## § 80. Матэматычная школа.

Матэматычная мэтода дасьледу грамадзкіх зьявішчаў палягае на абстракцыйным ізоляваньні зьявішчаў, якія даюцца прадставіць сябе ў цыфрах. Прыхільнікі матэматычнай школы стаяць на тым становішчы, што тэорыю эканомікі можна абняць точна матэматычнымі формуламі. Як іх асновай і спосабам рашэньня ёсьць раўненьне, таксама бачаць яго і ў вытворстве, гандлі, крэдыце і г. д.

Даныя аб эканамічных зьявішчах напр., аб рынковых цэнах, аб біржавых курсах, зьяўляюцца рэзультатам пачуцьця болю і прыемнасьці, паўстаючых у чалавека з прычыны яго патрэбаў, а гэтым самым зьяўляюцца пасрэдняй прыблізнай мэтай гэтых пачуцьцёў.

Як ужо было сказана вышэй, матэматычная школа стараецца ўсе эканамічныя зьявішчы выразіць раўненьнем. Так напр., мена зьяўляецца раўненьнем, у якім адна старана ёсьць адданы прадмет, другая — атрыманы; вытворства ёсьць раўненьнем, у якім адна часьць ёсьць лік ужытнага дабра, другая вытвараны прадмет; пазыка на процанты ёсьць раўненьнем, у якім адна часьць ёсьць адданы прадмет другая — атрыманы прадмет з далічэньнем пэўнай роўнавартасьці за мінулы час і г. г. Нам вядома што асновай матэматыкі, асяродкам цяжкасьці і спосабам рашаньня задач ёсьць раўненьне. Бо-тож-бо-то эканамістыя, застасоўваючы матэматычную мэтоду да вырашаньня гаспадарчых пытаньняў, маючы ўжо раўненьне, выражаючае нейкае зьявішча (послугоўваючыся альгебрычнымі знакамі) стараюцца гэтай дарогай вырашаць эканамічныя пытаньні.

Матэматычная школа да паняцьця аб вытворстве далучае, апрача прыроды, працы і капіталу, чацьвёрты дзейнік — **прадпрыемлівасьць.** Яна кажа, што калі няма прадпрыемніка, то зямля будзе ляжаць адлогам, работнік ня знойдзе сабе працы, а капітал ня будзе прыносіць ніякіх даходаў у форме процантаў. Толькі прадпрыемнік бярэ на



сябе адказнасьць за арганізацыю вытворства і ён сам арганізуе яго, арэндуючы ад зямельных уласьнікаў зямлю за пэўны чынш, пазычаючы капітал ад капіталістых за пэўныя процанты і наймаючы работніцкую сілу.

Эканамістыя з гэтае школы стварылі сваю тэорыю цэнаў. Па іхняму істнуюць два рынкі: адзін рынак услуг і другі рынак вытвараў. На рынку ўслуг дары прыроды (зямля, пад'земныя багацьці, сілы прыроды і інш.), капітал (у рознай форме крэдыту) і рабочая сіла зьяўляюцца ўслугамі, якія прапануюцца на заарэндаваньне. Прадпрыемнікі тут выступаюць у ролі патрабавальнікаў і на тых або іншых варунках закупляюць услугі і пушчаюць у ход вытворства. На рынку ўслугаў выступаюць з аднаго боку ўласьнікі сілаў прыроды, капіталу і людзкой работніцкай сілы з другога – прадпрыемнікі. У залежнасьці ад посулу і патрабаваньня на рынку формуюцца цэны на ўсе ўслугі. Калі прадпрыемнікаў будзе шмат у параўнаньні з лікам услугаў, то цэны будуць мець павышальную тэндэнцыю і наадварот.

На рынку вытвараў (гатовых тавараў) ролі абедзьвюх старон мяняюцца. Прадпрыемнікі прапануюць свае тавары, а работнікі, зямельныя ўласьнікі, капіталістыя спаўняюць ролю патрабавальнікаў. На гэтым рынку вытвараў цэны таксама формуюцца ў залежнасьці ад посулу і ад патрабаваньня. Розьніца між рынкам услугаў і рынкам вытвараў зьяўляецца ў тым, што на першым рынку прадпрыемнікі спаўняюць ролю патрабавальнікаў услуг, а на другім—ролю пасуляючых тавары і наадварот, зямельныя ўласьнікі, уласьнікі капіталаў і работнікі на першым рынку спаўняюць ролю пасуляючых услугі, а на другім рынку ролю патрабавальнікаў тавараў. Такім чынам, рынак услугаў і рынак гатовых тавараў знаходзіцца ў супольнай залежнасьці. Калі скажам, на рынку ўслугаў зьяўляецца ажыўленьне, г. зн. вялікае патрабаваньне на ўслугі (дзейнікі вытворства), то гэтае ажыўленьне выклікае большы зварот (рух) на тварным рынку, бо работнік мае працу і атрымлівае заработную плату, зямельны ўласьнік атрымлівае чынш, а ўласьнік капіталаў бярэ процанты і затым усе яны маюць магчымасьць купляць ад прадпрыемніка гатовыя тавары. Застой на рынку ўслугаў адбіваецца такім самым застойным рухам на таварным рынку: патрабаваньне на тавары будзе малое. Каб гаспадарчае жыцьцё ішло нармальнай дарогай, трэба каб істнавала раўнавага між абодвымі рынкамі. Гэта раўнавага ёсьць ідэальнай формай цяперашняга гаспадарчага жыцьця.

Да гэтай школы належаць: Jevons, Walras, Pareto, Boldio і інш.

## § 81. Соцыялізм.

Соцыялістычная школа існуе так даўно, як лібэральная, а можна нават цьвярдзіць, што ёсьць яна старэйшаю, бо соцыялістыя былі нават у старадаўніх часох, раней як паўстала навука палітычнае эканоміі. Калі папярэднія школы найбольш займаліся справамі, што датычаць вытворства, то соцыялістычныя школы найбольшую ўвагу зварачуюць на разьмеркаваньне даходу. **Сацыялізмам называем эканамічны кірунак, які імкнецца да скасаваньня няроўнасьці ў разьмеркаваньні грамадзкага даходу, якая паўстае з прычыны права ўласнасьці на сродкі вытворства.**

Усе соцыялістычныя школы лічаць цяперашнюю капіталістычную арганізацыю грамадзянства за поўную розных недарэчнасьцяў, якія не даюцца адкінуць, а гэтым самым прызначаную на згубу ў бліжэйшай або далейшай будучыні. Крыніцай усяго зла ёсьць індывідуальная ўласнасьць (выключнае права карыстаньня і распараджаньня рэчамі аж да нішчэньня іх), якая заўсёды імкнецца да адданьня інтарэсу цэлага грамадзянства ў рукі невялікага ліку адзінак каб жменька прывіліяваных людзей жыла коштам спролетарызаваных масаў.

Соцыялістычныя школы чакаюць новага ладу, у якімбы прыватную ўласнасьць і працу на чужы рахунак, калі ня зусім скасаваць, то прынамсі зьвясьці да мінімуму. Узалежнасьці ад поглядаў на гэта соцыялістычныя школы можна падзяліць: на 1) **камуністых і анархістых,** жадаючых скасаваньня прыватнай уласнасьці зусім; 2) на **колектывістых,**—якія дамагаюцца скасаваньня прыватнай уласнасьці толькі на сродкі вытворства; урэшце, на **народных соцыялістых**, жадаючых скасаваньня прыватнай уласнасьці толькі на зямлю і дамы. Глянем цяпер, як гістарычна разьвівалася соцыялістычная школа.

а) **Рацыяналістычны соцыялізм.** Ужо ў старадаўніх часох тагочасныя людзі навукі займаліся пытаньнямі, што датычаць арганізацыі грамадзянства. **Плятон** (429 — 384 п. н. Х.) быў прыхільнікам соцыялістычнага ладу грамадзянства і ў сваім творы „Рэспубліка" апісвае ідэальны грамадзкі лад.

Пазьней **Тамаш Морус** (1478 — 1535 г.) у сваім творы „Утопія" крытыкуе тагочасны грамадзкі лад і процістаўляе яму ідэальны лад, які быццам існуе на востраве Утопіі. Т. Морус прызнае праступак за рэзультат благой арганізацыі грамадзянства; як толькі зьменіцца на лепшае гэты лад, дык зьнікнуць і праступкі. Жыцьцё на востраве Утопіі арганізавана так: Утопія мае 54 месты і вясковае насяленьне; ўсе працуюць на зьмену, то ў месце, то на вёсцы; працуюць толькі па 6 гадзін у дзень, рэшту часу выпаўняе



навука, ігры; гаспадарствам кіруюць асобы, выбіраныя штогод; горшыя работы выпаўняюць парабкі — нявольнікі, якіх палажэньне так добрае, што чужынцы самі па добрай волі (самахоць) ідуць у такую няволю; законаў ёсьць так мала, што кожны ведае іх напамяць; золата прызначана на кайданы.

**Тамаш Компанэля** (1568 — 1639), прыхільнік соцыялістычнага ладу, бяручы прыклад з Плятона і Моруса, расказвае аб „Гаспадарстве Сонца", якое адведаць меў пэўны капітан. Гэным гаспадарствам кіруе Мэтафізык—найвышэйшы духоўнік, пры дапамозе міністраў: Сіла (М. Вайны), Мудрасьць (М. Мастацтва і Навукі), а ніжэйшыя ўраднікі набіраюцца з вучоных. Уся веда выпісана на мурох места, каб кожны падчас спацыру мог паглыбляць сваю навуковую маемасьць; уласнасьць ёсьць толькі супольная, гаспадарчае дабро дзеляць паміж усімі спэцыяльныя ўраднікі; дзякуючы поступу тэхнікі, ўсе працуюць толькі 4 гадзіны ў дзень; вазы езьдзяць самі пры помачы нарусаў і г. д., багатае апрананьне, падмалёўваньне, нашэньне абсацаў было карана сьмерцяй.

**Робэрт Оўэн** (R. Owen) 1771—1856 г.). Самавук, дзякуючы нязвычайнай энэргіі і працавітасьці, даходзе да дырэктара фабрыкі, дзе працуе моральна найгоршы работніцкі элемэнт. У працягу некалькіх гадоў Оўэн перарабляе сваю работніцкую калёнію на прыкладную асаду дарогай паляпшэньня матар'яльных варункаў работнікаў, скарочваньня часу працы, паляпшэньня кватэрных варункаў, навукай і г. д. Вялікая ўдача, якая была спадарожніцай усіх яго пачынаньняў, падахвочвае яго да пляну перарабленьня ўсяго грамадзянства. Ідучы ў гэтым кірунку Оўэн распрадаў усю сваю маемасьць, пераехаў у Амэрыку і там заляжыў новую колёнію, па прыкладу якой мелася перарабіцца ўся арганізацыя грамадзянства. Аднак гэта колёнія з ідэальным ладам распалася, дзякуючы нязгодзе яе жыхароў.

Робэрт Оўэн быў ініцыятарам саюзу вялікіх грамадзкіх рэформаў, якога мэтай было паляпшэньне быту работніцкае клясы праз: аграніччэньне гадзін працы, забарону працаваць дзецям, арганізацыю супольных работніцкіх таварыстваў, зьберагальных касаў і спажывецкіх крамаў. Р. Оўэн быў тварцом работніцкіх прафэсыянальных саюзаў.

**Кароль Фур'е** (Charle Fourier 1772—1837) спачатку працаваў як суб'ект у гандлёвай фірме, але згубіўшы ахвоту да сваe працы, бо на кожным кроку спатыкаў эксплёатацыю, Фур'е бярэцца за ідэю перарабленьня грамадзянства. Паводле Фур'е чалавек мае прыроджаныя інстынкты заўсёды добрыя, абы толькі іх добра выкарыстаць. Каб гэтыя інстынкты мэтна выкарыстаць, трэба арганізаваць камунальнае жыцьцё ў асобных інстытуцыях, называных фалянстэ-

рамі. Фалянстэры складаюцца з воласьцяў—фалянгаў, у якіх самастойна арганізавана гаспадарчае жыцьцё.

Дзеля таго, што час працы знаходзіцца ў адваротнапрапорцыянальных адносінах да прыемнасьці, з якой выпаўняецца праца (закон атракцыі), у фалянстэрах працуюць на зьмену: трохі працуюць на ральлі, трохі займаюцца рамяслом і г. д.

Уласнасьць ёсьць супольнай; выхаваньне дзяцей апіраецца на ўмелым разьвіцьці прыроджаных інстынктаў. Збудаваўшы модэль фалянстэру К. Фур'е прабаваў схіліць розных багатыроў і палітыкаў да субсыдываньня гэтых інстытуцыяў і да канца свайго жыцьця чакаў па 2 гадзіны штодзень на паяўленьне аднаго з 4.000 кандыдатаў, вызначаных ім, які мае даць яму 15.000.000 франкаў на зьдзейсьненьне проектаў.

К. Фур'е ў сваіх проектах меў на мэце ўвясьці комунальны лад, выкарыстаць закон атракцыі працы, выкінуць вялікі ланцуг пасрэднікаў пры мене, абняць усё вытворства праз консумэнтаў. Гісторыя аб „яблыку“ Фур'е, якая трапілася яму ў жыцьці, вельмі ярка выказвае шкоднасьць вялікага ліку гандляроў, праз рукі якіх кожны тавар праходзе ад прадуцэнта да консумэнта. Нягодзячыся з гэтакім станам рэчаў, і каб абмінуць ланцуг гандляроў, Фур'е палажыў асновы пад ідэю коопэратывізму.

**Сэн-Сімон** (Saint Simon 1760—1825) таксама прыхільнік социялістычнага ладу ў сваёй „Параболі“ крытыкуе цяперашні грамадзкі лад. Дзеліць ён усіх людзей на „трутняў“ і „пчолаў“,—працавітых і гультаёў; будучы лад „індустрыялізм“ будзе мець толькі працавітых людзей; грамадзянства будзе арганізавана на спосаб варстатаў, кіраваных банкерамі і прамыслоўцамі, якія маюць дарадчыя органы—палаты зложаныя з спэцыялістых усялякіх галін жыцьця. Сэн-Сімон дамагаецца каб усе занятні былі публічнымі функцыямі, дзеленымі і аплачванымі гаспадарствам. У такім ладзе кожны атрымліваў-бы паводле сваe здольнасьці і дзеяньняў.

Усе вышэй успомненыя прыхільнікі соцыялізму належаць да кірунку рацыяналістычнага, або, як некаторыя называюць, утопічнага соцыялізму. Аснаўной тэзай гэтага комуністычнага кірунку было тое, што ён хацеў паправіць грамадзкія адносіны дарогай рэформаў праведзеных па-за грамадзянствам, падаваў проекты перабудовы грамадзкага ладу не апёртыя на эканамічных законах, бо не апіраў іх на сілах грамадзянства, а на добрай волі адзінак, адкідаючы думку аб здэтэрмінаваным гаспадарчым разьвіцьці.

б) **Навуковы соцыялізм**. Навуковыя асновы цяперашняга соцыялізму найцясьней вяжуцца з Каралём Марксам, якога можна лічыць тварцом гэтага кірунку ў палітычнай эканоміі. Апрача Маркса да гэтай школы належаць Ф. Эн-



гэльс, Ф. Ляссаль і інш. Школа гэта мае характар наскрозь дэтэрміністычны і зусім не пярэчыць істнаваньню натуральных (прыродных) законаў. Толькі, падчас, калі з гэтымі словамі „закон натуры“ лібэральная школа лучыла паняцьце аб сталасьці і нязьменнасьці, то для навуковага соцыялізму азначае яно ідэю перамены і бесканечнага ператвараньня. У аснове навук К. Маркса ляжаць 3 тэорыі: **тэорыя гістарычнага матэрыялізму, тэорыя надвартасьці і тэорыя клясавой барацьбы**.

**Тэорыя гістарычнага матэрыялізму** заключаецца ў тым, што гаспадарчыя адносіны, або формы вытворства і тэхнікі прадукцыі, становяць аб усіх праявах грамадзкага жыцьця, хаця-бы ад гаспадаркі найдалейшых і ў герархіі грамадзкіх фактаў найвышэйшых: аб палітычным ладзе, аб этычных поглядах, рэлігійных, эстэтычных і інш. Усялякая новая здабыча ў галіне тэхнікі, пасьля прытарнаваньня яе ў прадукцыі, зьмяняе грамадзкі лад, зьмяняе рэлігійныя вераваньні, палітычны лад і інш. К. Маркс пісаў: „Мяняючы формы прадукцыі, зьмяняюць людзі грамадзкія адносіны. Ручны млын дае фэодальнае грамадзанства, паравы млын—грамадзянства з прадпрыемнікам–капіталістым. У зьвязку з тым, што заўсёды ёсьць поступ у тэхніцы, з яго разьвіцьцём, мусяць наступаць перамены грамадзкага ладу“.

Вартасьць тавараў, паводле Маркса, мерыцца грамадзка-неабходнай працай, г. ё. працай, пры якой увесь рынак будзе задаволены.

**Тэорыя надвартасьці** — апіраецца на прадукцыйнасьці працы. Чалавек у працягу пэўнага часу можа больш вытварыць, чым патрабуе на сваё ўтрыманьне. Вот-жа-ж паводле Маркса прадпрыемнік змушае работніка да поўнай працы, г. зн. да адданьня з боку работнікаў усіх сваіх сілаў, а плаціць яму толькі за неабходную працу, г. зн. за тую часьць працы, якая была-б патрэбна, каб работнік вытварыў сабе сваe сродкі ўтрыманьня. Гэта розьніца паміж поўнай працай і неабходнай пры прадажы тавару ідзе проста ў кішаню капіталістага.

Вось як апісвае тварэньне дадатковай вартасьці К. Каўтскі:

„Вот мы маем ткача, працуючага на ўласны рахунак. Ткацкі варстат ёсьць ягонай уласнасьцю, сам ён купляе пражу, працуе столькі і ў такім часе, калі захоча; прадукт працы ёсьць яго ўласнасьцьцю. Аднак, дзякуючы абядненьню, ён змушаны прадаць варстат. З чаго ён будзе жыць, калі не наймецца капіталістаму, каб для яго працаваць?! Капіталісты купляе работніцкую сілу ткача, варстат, пражу і кажа яму працаваць пры сваім варстаце. Куплены капіталістым ткацкі варстат ёсьць можа тым самым, што прадаў

ткач. Калі-б нават ня так было, то аднак ткач тчэ далей тым самым спосабам, што і даўней; звонку працэс працы зусім не зьмяніўся.

А ўсё-ж адбыліся дзьве вялікія перамены; ткач не працуе больш для сябе, але для капіталістага. Капіталісты пільнуе яго пры працы і даглядае, каб не працаваў павольна або нядбала і г. д., апрача таго прадукт працы работніка не да яго самога належыць, але да капіталістага.

Гэта ёсьць першы ўплыў капіталу на працэс працы, па апанаваньні ім працэсу вытвараньня. Як улажыўся цяпер працэс тварэньня вартасьці?

Дапусьцім, што капіталісты купіў работніцкую сілу на адзін дзень. Неабходныя для ўтрыманьня работніка сродкі жыцьця былі вытвараны ў працягу 6 гадзін. Стольні-ж часу такой жа працы ўмяшчаюць 3 маркі. Капіталісты купіў работніцкую сілу за суму роўную яе вартасьці; плаціць работніку за дзень 3 маркі.

Дапусьцім, што капіталісты лічыць баво́ўняную пражу за ўжытковую вартасьць, якое вельмі шукаюць і якая лёгка дасцца прадаць, і пастанаўляе такі вытвараць пражу, купляе прылады працы—для прастаты прымем, што імі зьяўляюцца асобныя верацёны і бавоўна. У адным фунце бавоўны зьмяшчаюцца — дапусьцім — дзьве гадзіны працы; каштуе ён 1 марку: з фунта бавоўны выпралі фунт пражы. Пры выпражы 100 фунтаў бавоўны будзе спажыта напр. адно верацяно; пры выпражы 1 фунта $\frac{1}{100}$ верацяна. Верацяно зьмяшчае 20 гадзін працы, дык раўняецца 10 маркам. За гадзіну можна выпрасьці 2 ф. бавоўны, а за 6 гадзін 12 фунтаў; гаворым увесь час аб нармальных, у сярэднім грамадзка-неабходных варунках вытворства.

Колькі вартасьці будзе ўмяшчаць у гэтых варунках 1 фунт пражы?

Перш за ўсё трэба прыняць пад увагу вартасьць спажытых пры вытвараньні верацён і бавоўны. Уходзяць яны без усялякіх перамен у прадукт вытворства. Ужытковая вартасьць бавоўны і верацена зьмянілася, аднак менная вартасьць ёсьць тая самая. Зразумелым робіцца гэта, калі наглядзець на розныя, да вытвараньня аканчальнага прадукту неабходныя працэсы працы, як наступаючыя па сабе часьці таго самага працэсу. Дапусьцім, што прадзільнік ёсьць адначасна плянтатарам бавоўны і выпрадае бавоўну заразжа пасьля яе атрыманьня; пража ёсьць цяпер вынікам працы плянтатара і прадзільніка, а яе вартасьць мерым часам працы, грамадзка - неабходным для вытварэньня бавоўны і перарабленьня яе ў пражу. У вартасьці вытвару (прадукту) нічога ня зьменіцца, калі абодва гэтыя працэсы працы, пры рэшце нязьменных варункаў — былі выкананы на рахунак розных людзей. Вартасьць ператворанай бавоўны зьявіцца другі раз у пражы; тое самое ёсьць з вартасьцю ўжытых верацён. Аб паможных матэр'ялах не гаворым тут дзеля ўпрашчэньня вывадаў.



Да перанесенай вартасьці далучаецца вартасьць, дададзеная бавоўне працай прадзільніка. У працягу гадзіны можам выпрасьці 2 фунты; дапусьцім, што марка заключае 2 гадзіны працы. Тады гадзіна працы стварыла вартасьць $^1/_2$ маркі.

Вартасьць 1 фунта пражы раўняецца вартасьці: 1 фунта бавоўны (= 1 мрк.) + $^1/_{100}$ верацена (= $^1/_{10}$ мрк.) + $^1/_2$ працы ( = $^1/_4$ мрк.), або ў марках : 1 + $^1/_{10}$ + $^1/_4$ = 1 мкр. 35 фэнігаў.

За 6 гадзін будзе выпрадзена 12 ф. пражы, вартасьці 16 мрк. 20 ф. Колькі каштавала капіталістаму дапяць гэтага рэзультату? Ён выдаў на 12 ф. бавоўны 12 мрк., на $^{12}/_{100}$ верацяна 1 мрк. 20 ф., на работніцкую сілу 3 мрк. Разам 16 мрк. 20 ф., дык столькі, колькі варта пража.

Дагэтуль праца не прынясла яму ніякай карысьці, купленая работніцкая сіла не стварыла яму яшчэ дадатковай вартасьці. Аднак нашага капіталістага ня страша гэта. Бо-ж ён купіў ужытковую вартасьць работніцкай сілы на цэлы дзень; купіў ён сумленна, за яе поўную вартасьць. Не намерваецца сказаць работніку: „Купіў я тваю работніцкую сілу за суму грашай, заключаючых у сябе 6 гадзін працы. Працаваў ты 6 гадзін для мяне, нашыя рахункі выраўняліся, бывай здароў!“. Замест гэтага кажа яму: „Купіў я тваю работніцкую сілу на цэлы дзень, праз увесь дзень належыш да мяне, дык працуй далей, аж нанолькі хопіць табе сілы, не марнуючы часу, бо ён ня твой, а мой“. Дык кажа ён работніку працаваць ня 6, але напр., 12 гадзін.

Пасьля далейшых 6 гадзін, па аканчаньні работніцкага дня, ён лічыць другі раз. Мае цяпер 24 ф. пражы вартых 32 мрк. 40 ф. Расходы такія: 24 ф. бавоўны за 24 мрк., $^{24}/_{100}$ верацяна за 2 мрк. 40 ф., 1 работніцкая сіла за 3 маркі, разам 29 мрк. 40 ф. З прыемнасьцю замыкае сваю рахунковую кнігу. Зыскаў 3 маркі; „зарабіў“ іх, як цьвердзіць. Зарабіў іх, дабыў дадатковую вартасьць, не перашагнуўшы законаў таварнай мены. Бо - ж купіў ён бавоўну, верацяно, работніцкую сілу паводле іх вартасьці. Здабыў дадатковую вартасьць, дзякуючы спажыцьцю купленых тавараў ня ў ролі прадметаў чулых паднябеньню, але прыладаў вытвараньня і дзякуючы таму, што выкарыстаў ужытковую ўласнасьць купленай работніцкай сілы па - за пэўны азначаны пункт.

Працэс вытворства пад панаваньнем таварнага вытвараньня заўсёды ёсьць працэсам тварэньня вартасьці, ня гледзячы на тое, ці выконваецца пры помачы ўласнай, ці

купленай работніцкай сілы; аднолькава-ж толькі прадоўжаны за пэўны працяг часу працэс тварэньня вартасьці робіцца таксама тварцом дадатковай вартасьці...

Так сама і селянін, абсяваючы сваю зямлю і рамесьленік працуючы на ўласны рахунак, могуць працаваць больш як неабходны час для выраўнаньня коштаў, спажытых на жыцьцё сродкаў. І яны могуць вытвараць дадатковую вартасьць і іх праца можа быць працэсам тварэньня дадатковай вартасьці. Але калі гэты працэс пачынае адбывацца пры помачы купленай чужой работніцкай сілы, тады ён ёсьць **капіталістычным працэсам вытворства, які па сваёй сутнасьці, з сваіх мэтаў і з мусу ёсьць працэсам тварэньня дадатковай вартасьці**".

**Тэорыя клясавай барацьбы.** Грамадзкай клясай Маркс называе грамадзкі слой, маючы адналітую (аднолькавую) эканамічную ідэолёгію. У грамадзянстве Маркс бачыць аснаўныя тры клясы: **пролетарыят** — кляса, якая сваё істнаваньне апірае толькі на сваёй працы (фізычнай або мыслёвай), кляса гэта жыве з дня на дзень, „жалезны закон платы" не пазваляе пролетарыяту на дабрабыт; **буржуазія**,— кляса дробных ўласьнікаў, якае цягне свае даходы з працы і капіталу пераважна невялікага; **капіталістыя**, — ўласьнікі сродкаў вытворства, дзякуючы якім маюць даходы бяз працы. Ёсьць яшчэ чацвёрты слой люмпэнпролетарыяту, злажанага з жабракоў і падонкаў, што жывуць коштам буржуазіі і капіталістых. Паводле Маркса, гісторыя людзкасьці ёсьць гісторыяй клясавай барацьбы. У кожным пэрыядзе часу істнуюць клясавыя антагонізмы, якія вельмі сільна выступаюць пры цяперашнім ладзе. Чым больш кляса капіталістых у пагоні за вялікімі прыбыткамі і канкурэнцыйнымі цэнамі на тавары вызысківае работнікаў, тым больш павялічваецца прорва паміж клясай пролетарыяту і капіталістых. Аднак капіталізм будзе апошняй формай антаганістычнай прадукцыі, рынець ён дзякуючы поступу тэхнікі, які вядзе за сабой акумуляцыю капіталаў і паўпэрызацыю масаў, і наступнай формай будзе колектывістычны лад, пры якім прылады вытворства будуць супольнай уласнасьцю ўсіх працуючых. Гэта схэматычна выясьняе Марксаўская піраміда.






Маркс кажа, што гаспадарчае разьвіцьцё выказвае тэндэнцыю да гібелі меншых самастойных прадпрыемстваў, так што прадукцыя концэнтруецца што-раз больш у руках невялікага ліку капіталістых, якія затрудняюць у сваіх руках што-раз большыя масы работнікаў. Капіталы, концэнтруючыся ў руках капіталістых павядуць за сабой зніканьне буржуазіі, якая будзе пролетарызавацца. А як надойдзе час, калі будуць істнаваць з аднаго боку вялізарныя масы пролетарыяту, а з другога — некалькі ўласьнікаў усяго капіталу, вельмі лёгка будзе адабраць ад іх прылады працы і аддаць пролетарыяту. Перавернецца тады піраміда цяперашняга грамадзкага ладу, на гары будзе той самы пролетарыят, які калісь быў на нізе. Наступіць гэта дарогай эвалюцыі, дарогай — концэнтрацыі капіталаў, якая мусіць прысьці як рэзультат перамен тэхнікі вытворства.

Каб даць больш ясны абраз гістарычнае перамены гаспадарчых адносін, як іх сабе прадстаўляў тварэц навуковага соцыялізму К. Маркс, ніжэй падаём вывады К. Каутскага з VII разьдзелу яго кнігі аб эканамічных навуках К. Маркса: ...„першабытны спосаб вытвараньня асноўваецца на грамадзкай, плянова арганізаванай працы і вымагае, каб прылады вытвараньня і вытвары былі грамадзкай уласнасьцю. Вытвары падлягаюць падзелу і ў зьвязку з гэтым робяцца індывідуальнай уласнасьцю, але настолькі, на колькі яны ёсьць прадметам ужытку. Як беспасрэдні плод грамадзкой працы, вытвары дастаюцца перш за ўсё грамадзянству.

Гэты спосаб вытворства астаецца выперты праз звычайнае таварнае вытвараньне незалежна ад сябе працуючых прыватных работнікаў, вытвараючых паасобку пры помачы ўласных прыладаў працы вытвары, якія становяць прыватную ўласнасьць кожнага з іх.

Аднак з звычайнага таварнага вытворства паўстае капіталістычнае таварнае вытворства; месца незалежна вытвараючых асобных работнікаў займаюць вялікія сконцэнтраваныя прадпрыемствы, вытвараючыя тавары незалежна ад сябе, але маючыя ўнутраную пляновую і грамадзкую арганізацыю вытворства. Дзякуючы таму, што гэтыя вялікія капіталістычныя прадпрыемствы займаюць між сабой палажэньне вытварыцеляў тавараў, іх адносіны апіраюцца на мене тавараў, значыцца на праве ўласнасьці звычайнага таварнага вытвараньня, на прыватнай уласнасьці прыладаў вытворства і вытвараў.

У гэтым стане прыватная ўласнасьць зьмяняецца на сваю проціележнасьць.

У звычайным таварным вытворстве прыватная ўласнасьць была вынікам і пладом працы. Работнік быў уласьнікам сваіх прыладаў вытворства і сваіх вытвараў. Капіта-

лістычнае вытворства зрывае сувязь між працаю і ўласнасьцю. Вытвар не належыць больш да работніка. Прылады вытворства і вытвары належаць да непрацуючых. Зьмена вытворства ў грамадзкае на капіталістычнай аснове даконваецца што-раз то ў большай меры, як зьмена непрацуючых на ўласьнікоў багацьця, а работнікаў на неўладаючых...

У сыстэме таварнага вытвараньня грамадзкія варункі вытворства робяцца сілай перарастаючай асобных вытварыцеляў. Вытварыцель робіцца нявольнікам вытворства; яго палажэньне робіцца тым горшым, што яго паны ня кажуць яму, што мае рабіць, не паведамляюць яго, якія ёсьць іх патрэбы, але кажуць яму іх адгадваць. Вытворства падлягае цяпер законам, незалежным ад вытварыцеля, дзеючым часта нароўні з законамі прыроды незалежна ад яго волі, законам праяўляючымся ў пэрыядычным наступаньні ненармальных адносін, як спаданьне цэн, дарагоўля і г. д. Гэтыя ненармальнасьці паскольні вынікаюць з грамадзкіх прычын ёсьць невялікія, абмяжоўваюцца да цесных рамак пакуль пануе звычайнае таварнае вытворства адпаведна да ніжэйшай прадукцыі раздробленных прадпрыемстваў асобных работнікаў.

Капіталістычны спосаб вытворства падымае ў вялізных разьмерах прадукцыўнасьць працы, распутвае ён і колёсальна павялічвае вытворчыя сілы, або лепей грамадзкай, мэтна з'арганізаванай, працы, бяручай на свае ўслугі зьняволеныя ведай сілы прыроды. Дзякуючы гэтаму мяняецца пэрыядычны паварот ненармальных адносін, у якіх праяўляюцца законы таварнага вытворства, а якія даўней вялі за сабой толькі мясцовыя, лёгка цярпімыя і перамагальныя няпрыемнасьці ў перыядычныя катастрофы, трываючыя цэлыя гады, адведваючыя гаспадарствы і контынэнты, вядучыя за сабой страшэнныя зьнішчэньні; мяняюцца яны ў пэрыядычныя катастрофы, якіх разьмеры і інтэнсыўнасьць узрастаюць разам з капіталістычным спосабам вытворства і — як здаецца — робяцца хранічнай хваробай.

У ладзе першабытнага комунізму, у якім прадукт грамадзкай працы належыць да грамадзянства і якое само яго дзеліць паводле грамадзкіх патрэбаў — між адзінкамі, узрастае разам з прадукцыйнасьцю працы і ўдзел адзінкі ў яе выніках.

Пад панаваньнем таварнага вытвараньня ўзрастае маса ўжытковых вартасьцяў, адказваючая пэўнай велічыні вартасьці разам з узростам прадукцыйнасьці працы. У звычайным таварным вытвараньні прадукт працы звычайна належыць да работніка. Можа ён яго цалком або часьцямі спажыць; у гэтым выпадку ўзрастае колькасьць прадметаў ужытку, якімі распараджаецца адносна да ўзросту прадукцыйнасьці яго працы. Можа ён аднак таксама вымяняць цэлы вытвар або яго часьць; у звычайным таварным вытвараньні падлягае мене толькі малая часьць вытвару... Тутака ўзрост прадукцыйнасьці працы зусім выходзе на карысьць работніка.



У капіталістычным спосабе вытвараньня работніцкая сіла сама ёсьць таварам, якой вартасьць, таксама як і кожнага іншага тавару зьмяншаецца ў залежнасьці ад узросту прадукцыйнасьці працы. Чым большая прадукцыйнасьць працы, тым меншы адносна атрымлівае ўдзел у яе вытвары работнік у цане свае работніцкай сілы. Чым больш пануючым будзе капіталістычны спосаб вытворства, тым больш маса народу складваецца з нанятых работнікаў, тым больш будзе такіх, якія не карыстаюць з пладоў павялічанай прадукцыйнасьці свае працы.

Усе гэтыя процілежнасьці вытвараюць па неабходнасьці спрэчкі між клясай капіталістых і работнікаў, спрэчкі, якія будзяць клясовую сьведамасьць работнікаў і папіхаюць іх да палітычнай дзейнасьці, прызываючы да жыцьця ўва ўсіх капіталістычных краёх работніцкія партыі...

Усё імкнецца да разьвязаньня супярэчнасьцяў уцялесьненых у капіталістычным спосабе вытворства, супярэчнасьцяў між грамадзкім характарам працы і формай уласнасьці прыладаў вытворства і вытвараў.

Здаецца, што ёсьць магчымыя толькі дзьве дарогі да разьвязкі гэтай супярэчнасьці: абедзьве імкнуцца пагадзіць спосаб вытворства з уласнасьцю. Адна з іх вядзе да скасаваньня грамадзкага спосабу працы, да павароту да простага таварнага вытвараньня, да заступленьня вялікага прадрыемства рамяслом і дробнай сялянскай уласнасьцю. Другая ня сіліцца прыстасаваць вытворства да спосабу прыўлашчэньня, але скарэй спосаб прыўлашчэньня да вытворства, дык вядзе яна да грамадзкай уласнасьці сродкаў вытворства і вытвараў...

То-ж пазнаём толькі адзіную дарогу, па якой пойдзе разьвіцьцё грамадзянства: ёй ёсьць прыстасаваньне формаў уласнасьці да формаў вытворства, забраньне прыладаў вытворства грамадзянствам, закончвае зусім правядзеньне зробленай капіталам толькі напалавіну перамены па-асобнага вытворства ў грамадзкае...

Месца анархічнага вытворства тавараў займе пляновая і сьвядомая арганізацыя прадукцыі. А разам з гэтым пачнецца для чалавецтва новая эра"...

в) **Аграрны соцыялізм.** Нацыяналізацыя зямлі, называная таксама аграрным колектывізмам, ёсьць фактычна частковым колектывізмам, так як колектывізм частковым комунізмам. Колектывізм дамагаецца супольнай уласнасці капіталаў і сродкаў прадукцыі, пакідаючы ў прыватнай уласнасьці сродкі спажыцьця. Аграрны соцыялізм дамагаецца

нацыяналізацыі зямлі, хоча ўвясьці толькі супольную зямельную ўласнасьць, пакідаючы на іншае дабро прыватную ўласнасьць.

Аграрны соцыялізм апіраецца на такой аснове. Прыватная ўласнасьць настолькі мае рацыю быту, на колькі адносіцца да вытвараў людзкой працы. У сувязі з тым, што зямля ёсьць творам прыроды, а не чалавека, а прырода стварыла яе для ўсіх, дзеля гэтага зямля ня можа быць прадметам прыватнай уласнасьці, а калі такая існуе, дык ёсьць нічым іншым, як самапраўствам. Дык трэба з гэтым раз пакончыць і алдаць зямлю толькі ўпраўненым, г. зн. грамадзянству. Дасягнуць гэтага можна рознымі спосабамі.

Першы з іх заключаецца ў адабраньні зямельнае ўласнасьці характару векавога і замене яго ў род арэнды, або прасьцей у часовую арэнду, аддаваную гаспадарствам дарогай концэсіі.

Другі спосаб, называны сыстэмай аднаго падатку, палягаў-бы проста на абцяжэньні зямельнае ўласнасьці ўзрастаючым падаткам: гэты падатак павінен-бы быць так сконструаваны, каб павышаўся ў меру ўзросту даходу з зямлі.

Прадстаўнікамі аграрнага соцыялізму, які ўказвае на неабходнасьць уграмадзкаваньня зямельнай рэнты і спыненьня толькі зямельнае прыватнае ўласнасьці, як крыніцы няроўнага разьмеркаваньня грамадзкага даходу былі ў Амэрыцы Г. Жорж і ў Англіі А. Р. Валас.

г) **Рэвізіянізм**. Крытыку тэорыі Маркса падняў соцыялістычны кірунак называны рэвізіянізмам з Бэрнштэйнам і Давідам на чале. Тэорыю вартасьці і надвартасьці Маркса крытыкуе псыхолёгічная школа (Бом - Бавэрк „Тэорыя эксплёатацыі“).

Той нібы гістарычны закон, становячы аснову ўсяго колектывізму, паводле якога індывідуальнае вытворства паступова мусіць перайсьці ў колектыўнае вытворства, ёсьць не адпаведным уагульненьнем, бо многа ёсьць гаспадарчых зьявішчаў зусім яму пярэчных. У зямельным вытворстве ня можна прывясьці ніякага доваду, які-бы гаварыў за гэта, а нават, у меру ўзросту насяленьня і поступу земляробскай культуры, земляробскія гаспадаркі робяцца штораз меншымі, а сыстэму акцыйных супалак бачым прытарнаванай да зямлі толькі ў некалькіх зусім вынятковых выпадках.

Э. Давід цьвердзіць, што ў аграрных адносінах ідзе дэконцэнтрацыя капіталаў, бо земляробскае вытворства ня ёсьць мэханічным працэсам, але арганічным, ня можа карыстаць з такога падзелу працы, як мэханічнае вытворства, ня можа карыстаць з цэнтральных маторaў. Наадварот, малая зямельная ўласнасьць можа быць эксплёатована інтэнсыўней за вялікую, яна больш незалежна ад рынковых



цэнаў на збожжа, ад гаспадарчых крызысаў і г. д., могучы адначасна вясьці гаспадарку малочную, гадоўлю дамовых птушак і г. д.

Што датычыць концэнтрацыі капіталаў, то хоць фактычна адбываецца яна ў некаторых галінах прамысловасьці, аднак у іншых заўсёды пераважае дробная прадукцыя, якая з часам пад уплывам новых вынаходаў у галіне тэхнікі, напрыклад, адпаведнага выкарыстаньня матораў унутраннага згараньня, можа заняць дамінуючую ролю ў прамысловасьці.

З другога ізноў боку сіла ўласьнікаў ня толькі зьмяншаецца, як кажуць колектывістыя, але наадварот заўсёды ўзрастае. Тысячы малых капіталістых, маючых дзяржаўную рэнту, гарадзкія облігацыі, чугуначныя акцыі, або закладныя лісты — а лічба іх расьце заўсёды — аказваюць таксама прывязаннасьць да сваіх вартасных папераў, як сялянін да свае зямлі. Есьць ведама, прынялі-б яны з ахвотай прынцып роўнага разьмеркаваньня, якое пазволіла-б ім павялічэньне свайго капіталу шляхам удзелу ў маемасьці багатых, але напэўна не афяравалі-б сваіх зьберажэньняў на карысьць неазначанага колектыўнага права на грамадзкі капітал.

Прадстаўнік рэвізіяністычнага кірунку Бэрнштэйн цьвердзіць, што ў гістарычным разьвіцьці рашучае значэньне маюць ня толькі эканамічныя дзейнікі, але і адносіны палітычныя, праўныя, рэлігійныя, звычаёвыя; а соцыялістычная супольная ўласнасьць наступіць дзякуючы арганічнай грамадзкай эвалюцыі.

Проціў рэвізіяністычнага кірунку выступаюць „**отродоксы**“ Каўтскі, Вандэрвэльд і іншыя, якія цьвердзяць, што парцэляцыя зямлі, якая цяпер адбываецца, ёсьць пераходная ступень да цэнтралізацыі зямельнай прадукцыі і што дробныя ўласьнікі трымаюцца зямлі толькі таму, што вядуць „конкурэнцыю з галоднай сьмерцяй“.

## § 82. Грамадзкі солідарызм.

Калі індывідуалізм лібэральнай (клясычнай) школы пачаў уступаць у граніцы суровага эгоізму, з другога боку, соцыялізм імкнуўся да скасаваньня зусім значэньня індывідуальнасьці, — тады, як рэакцыя проці абодвух кірункаў, зьяўляецца іншы кірунак, сярэдні умяркаваны, названы грамадзкім солідарызмам. Пабудавалі яго на сьведамасьці ўзаемнай залежнасьці людзей між сабой. Мае ён на мэце захаваньне індывідуалізму, але абмяжованага поглядамі на грамадзкае дабро. Тут ходзе аб выработцы ў сабе пачуцьця грамадзкага абавязку і адказнасьці за свае па-

ступкі. Адзінка праз усё сваё жыцьцё бяз перастанку карыстаецца ўстановамі і грамадзкімі вытварамі, на вытворства якіх складаецца магутны лік людзкой працы, укладанай у розных мясцох і часох. А калі адзінка ўжывае моральнае і матар'яльнае дабро розных грамадзянстваў, — дык абавязана аддаць (сплаціць) хоць часьць зробленага доўгу праз супольную працу з іншымі на карысьць цяперашніх і будучых пакаленьняў.

Школа солідарнасьці, паказваючы на коордынацыю плянэтнага ладу, на сымбіозу расьлін і зьвяроў, дамагаецца, каб таксама сярод людзёў месца барацьбы за існаваньне, заняло пачуцьцё лучнасьці інтарэсаў і аснова супольнае працы для аднаго і аднаго для ўсіх. Прынцып солідарнасьці ствapae цэлую сыстэму ўзаемных правоў і абавязкаў, маючых на мэце запэўненьне сабе якнайлепшых рэзультатаў непамерна рожнароднага падзелу працы.

Калі соцыялістычныя школы, паказываючы на яскравыя розьніцы грамадзкіх слаёў, цьвердзяць, што прычынай усяго благога ёсьць несправядлівы падзел даходаў і імкнуцца да зьнівэлюваньня багатых людзей—то солідарызм благое бачыць у існаваньні бедных (убогіх) слаёў і імкнецца да падняцьця іх матар'яльнага, інтэлектуальнага і этычнага жыцьця.

Школа солідарызму мае выдатных прадстаўнікоў: Ch. Gide, L. Bourgeois, Bougle, Fleurant, Fouillee, Durkheim, Lilienfeld, Schulze, Raiffeisein, Holyoakes, Мечнікоў і інш.

На аснове ідэі солідарызму конкрэтныя формы прыбірае **коопэратыўны рух**, які зарысоўвае штораз шырэйшае кола і абыймае ўсе функцыі грамадзкага гаспадарства: вытворства, зварот, разьмеркаваньне і консумцыю.

А. **Коопэратывізм**. Коопэратыўнай сыстэмай называем практычны кірунак, які ў дабравольным супольным дзеяньні відзіць ня толькі дарогу да правядзеньня пэўных паляпшэньняў, але цэлую праграму рэформы грамадзкага ладу. Гэта праграма ня зусім соцыялістычная, бо разьвіваецца ў межах пануючых цяпер гаспадарчых асноваў, аднак-жа імкнецца да ідэалу зусім іншага як капіталістычны, да індывідуалістычнага ладу, жадаючы зьдзейсьніць у будучыні найважнейшыя дамаганьні соцыялістых, а тымчасам — чым ня можна пагарджаць — прыносіць адразу паляпшэньне варункаў быту (існаваньня).

Ужо ў пачатку XIX ст. Оўэн у Англіі і Фур'е ў Францыі, прышлі да пераканаленьня, што пры помачы дабравольных таварыстваў можна-б зусім зьмяніць як людзей, так і цэлы грамадзкі лад. З гэтай мэтай выдумалі больш або менш абаснаваныя способы паступаньня, якія аднак ня былі ўвенчаны пажаданымі рэзультатамі. Але патрэбы практычнага жыцьця, магутнейшыя ад усялякіх сыстэмаў, вытварылі самародна ў розных краёх усялякія формы асоцыяцыі— ў Англіі спажывецкія таварыствы, ў Францыі вытворчыя, ў Нямеччыне пазычковыя, ў Даніі сельска - гаспадарчыя, ў Амэрыцы будаўляныя. Гэтыя таварыствы ўжо патрапілі зрабіць досіць паважныя перамены гаспадарчых варункаў, хаця абшар іх уплываў яшчэ скромны, але дасягнутыя рэзультаты пазваляюць мець найсьмялейшыя надзеі.



Коопэратыўны рух апіраецца на такіх аснаўных тэзах:

1. Усе коопэратыўныя таварыствы маюць на мэце эканамічнае ўнезалежненьне пэўных гаспадароў, так, каб яны маглі абыйсьціся без пасрэднікаў і выстарчыць самі сабе.

2. Усе коопэратыўныя таварыствы імкнуцца да заступленьня конкурэнцыі **солідарнасьцю**, індывідуалістычнага прынцыпу—кожны для сябе—прынцыпам: кожны для ўсіх.

3. Усе коопэратыўныя таварыствы стараюцца ўграмадзкаваць індывідуальную ўласнасьць, пазваляючы набываць яе шляхам малых удзелаў, і разам з гэтым твораць колектыўную ўласнасьць у форме супольнае маемасьці і інстытутаў агульнага ўжытку.

4. Усе коопэратыўныя таварыствы стараюцца адабраць ад капіталу ягоную кіраўнічую ролю ў вытворстве, і гэтым самым спыніць даходы на яго долю ў форме прыбыткаў і дывідэнды.

5. Усе коопэратыўныя таварыствы маюць выхаваўчыя мэты, бо не нарушаючы нічым індывідуальнасьці і ініцыятыўнасьці сваіх сяброў, нахіляюць іх да энэргічнае працы, да памаганьня іншым, а гэтым і сабе самому, паляпшаюць эканамічныя адносіны скасаваньнем рэклямы, ашуканства, падрабляньня тавараў і г. д. словам, імкнуцца да спыненьня эксплёатацыі і ўсялякіх прычын да спрэчак і няладу.

Копэратыўны кірунак, трымаючыся вышэй паданых тэзаў, стараецца распаўсюджваць коопэратывы. Коопэратыва гэта ёсьць беспартыйная арганізацыя апёртая на самапомачы і на раўнаўпраўненьні, маючая на мэце ўсебаковае заспакойваньне супольнымі сіламі матар'яльных і культурных патрэбаў свіх сяброў і ў сваёй дзеяльнасьці імкнецца яна да арганізацыі вытворства і мены згодна з інтарэсамі консумэнтаў.

Коопэратывы бываюць вытворскія, спажывецкія, пазычковыя, (коопэратыўныя банкі), страхавыя (ўзаемнае страхаваньне), будаўляныя і інш. Першая коопэратыва была заложана ў Rochdale (Рочдале ў Англіі) ў 1844 г. некалькімі ткачамі; дзеяльнасьць сваю пачала з закупленьня мукі і выпяканьня хлеба сваімі сябрамі. Коопэратыва гэта ў XIX ст. разраслася ў магутную інстытуцыю, абнімаючую мільёны работнікаў-сяброў. Прынцыпы прынятыя Рочдальскімі ткачамі былі прызнаны амаль ня ўсімі спажывецкімі коопэратывамі, а яны вось якія:

1. **Прадажа тавараў на рынковай цане,** 2) **прадажа тавараў толькі за гатоўку (бяз крэдыту),** 3) **прыбыткі дзеляцца пропорцыянальна да зробленых закупаў** і 4) **кожны сябра мае толькі права аднаго голасу.**

З чыстага даходу, які выкажацца балянсам, перш за ўсё выдзяляецца тая часьць, якая паўстала з закупаў не сяброў і яна пераліваецца ў грамадзкі фундуш таварыства. З рэшты даходу выдзяляецца пэўная часьць на апрацантаваньне капіталу, часьць на грамадзкі фундуш і на спэцыяльныя фундушы і астатак дзеліцца паміж сябрамі пропорцыянальна да зробленых закупаў.

Дробныя таварыствы спажыўцоў, утвораныя з мэтай закупліваньня тавароў па таньнейшых цэнах, у працягу прошлага сталецьця пачалі разьвівацца ня толькі, як вялікія прыкладна-арганізаваныя гандлёвыя прадпрыемствы, ўводзячыя лад у бязладную мену праз беспасярэднюю прыбліжэньне продуцэнтаў да консумэнтаў, але пастунова перайшлі да самастойнага вытворства, стварылі самастойныя эканамічныя вогнішчы, крэпасьці, як сказаў дэпутат Ансіль, з якіх булкамі хлеба бомбардуецца цяперашні капіталістычны лад.

У кожным выпадку коопэратывы ня толькі далі магчымасьць работніцкай клясе таньней і лепш карміцца праз скасаваньне пасрэднікаў, спэкуляцыі і ашуканства гандляроў, але перш за ўсё пазволілі работнікам узяць разьвязаньне іх справы ў свае рукі без аглядак на гаспадарства і патронаты — заініцыявалі новую гаспадарчую сыстэму, у якой рашучае значэньне мае праца, а не капітал.

К А Н Е Ц



# Статыстычныя даныя аб Беларусі. *)

**Табліца 5.**

Тэрыторыя этнографічнае Беларусі і яе насяленьне ў гады 1916 — 1919.

| Г У Б Э Р Н І | Простор у кв. кілём. | Насяленьне ў тыс. чалав. | Год спіску |
|---|---|---|---|
| 1. Магілёўшчына | 47.948 | 1.926 | 1916 |
| 2. Меншчына: цэнтр і ўсход<br>зах. ад (даўн. Навагарадз. і Пінск. пав.) | 91.212 | 2.421<br>433 | 1916<br>1919 |
| 3. Гарадзеншчына (бяз 3-х заходніх паветаў) | 29.505 | 609 | 1919 |
| 4. Беласточчына (3 заходн. паветы Горадзенск. губ. сумежныя прасторы Сувальскае губ. і інш.) | 11.900 | 400 | |
| 5. Віленшчына (бяз літоўскае часьці) | 33.250 | 1.138 | 1919 |
| 6. Віцебшчына (без латыскае часьці) | 35.800 | 1.229 | 1916 |
| 7. Смаленшчына (8 заходніх паветаў) | 42.066 | 1.402 | 1916 |
| 8. Чарнігаўшчына (паўночная частка) | 18.240 | 830 | 1916 |
| 9. Арлоўская губ. (ў Бранскім і Трубчаўскім пав.) | 6.030 | 162 | 1916 |
| 10. Калуская губ. (ў Жыздр. і Масальскім пав.) | 380 | 13 | 1916 |
| 11. Цьверская губ. (ў Ржэўскім і Асташкаўскім пав.) | 3.420 | 86 | 1916 |
| 12. Пскоўская губ. (ў Тарапецкім, В—Луцкім і Аночацкім пав.) | 2.130 | 49 | 1916 |
| 13. Курляндзкая губ. (ў Ілукштан. пав.) | 1.120 | 18 | 1919 |
| 14. Ковенская губ. (ў Н.-Аляксандраўскім або Браслаўскім пав.) | 1.610 | 67 | 1919 |
| Р а з а м | 324.605 | 10.783 | |

*) Даныя ўзяты з „Беларусі", выд. ў 1924 г. у Менску.

# ЛІТЭРАТУРА:


1. Charles Gide. Cours d'Economie politique, Paris, 1911. Karol Gide. Zasady Ekonomji społecznej, Warszawa 1920.
2. М. И. Туганъ-Барановскій. Основы политической экономіи.
3. „ „ „ Промышленные кризисы въ Англіи.
4. „ „ „ Націонализація земли.
5. „ „ „ Соціальныя основы кооперацін.
6. A. Bogdanow. Krótki wykład Ekonomji Politycznej tłum. J. Warska, Warszawa, 1905 r.
7. Z. Daszyńska-Golińska. Ekonomja Społeczna, Warszawa, 1907 r.
8. П. Н. Георгіевскій. Краткій учебникъ по политической экономіи С.-Петербургъ 1903 г.
9. Jevons W. S. Political Ekonomy, London and New York, 1892.
10. Kempner St. A. Ekonomja Społeczna, Warszawa, 1923 r.
11. Koszutski St. Podręcznik Ekonomji politycznej, Warszawa.
12. Lewiński J. St. Zasady Ekonomji politycznej, Warszawa.
13. Marshal Al. Zasady Ekonomiki, з ангельскага арыгіналу Principles of Economics пераклаў Cz. Znaniewski, Warszawa, 1925 г.
14. Mill John Stuart. Elements of political economy.
15. K. Pesyniak-Sanecki i Tomanek Fr. Zasady ekonomji społecznej, Lwów—Warszawa 1921.
16. Philippovitsch E. Zasady ekonomji społecznej (пер. з ням.).
17. Radziszewski H. Podręcznik Ekonomji politycznej, Warszawa 1919.
18. Ricardo Dawid. Zasady Ekonomji Politycznej i podatkowania (перакл. з ангельск.) Warszawa 1919 г.
19. Wagner Adolph. Grundlegung der politischen Oekonomie Leipzig 1892.
20. Walker F. Political Economy. London 1887.
21. Żeleznow W. Ekonomja Społeczna (пераклад) 1907 г.
22. Л. Любімаў. Палітычная Эканомія, перакл. П. Зянюка.
23. George Carey. Nauka ekonomji politycznej; Poznań 1902.
24. Fr. List. Das nationale System der polit Oekonomie.
25. Böhm-Bawerk. Gründzuge des wirtschaftlichen Güterwertes. Wien. 1884.
26. K. Marx – Das kapital. Hamburg 1867.
27. J. B. Say. Traité d'économie politique. Paris, 1814.
28. K. Gide i Rist. Historja doktryn ekonomicznych. 1921.





29. R. F. Bastias. Harmonies économiques. 1850.
30. R. Malthus. An Essay on the principle of population. London, 1805.
31. Adam Smith. An inguiry into the nature and causes of the wealth of nations. London. 1776.
32. F. Engels. Rozwój socjalizmu od utopji do nauki W-wa 1905.
33. Ch. Fourier. Théorie des quatres mouvement. 1808.
34. K. Kautsky. Nauki ekonomiczne K. Marksa. Warszawa 1906.
35. R. Owen. New vievs of Society, or essays upon the formation of human character. London, 1812.
36. Saint Simon Claude. Lettre d'un habitant de Genéve a ses contemporains. 1802.
37. М. И. Туганъ-Барановскій. Современный соціализмъ въ своемъ историческомъ развитіи. С.-Петербургъ 1906
38. F. Lassalle. O istocie Konstytucji, tłum. Warszawa.
39. K. Marks i F. Engels. Burżuazja, proletarjat i komunizm (Manifest komunistyczny) Warszawa 1905.
40. М. И. Туганъ-Барановскій. Теоретическіе основы марксизма. С.-Петербургъ, 1906.
41. D. Berstein. Zasady Socjalizmu i zadania socjalnej demokracji. Lwów. 1901.
42. E. Berstejn. Die Arbeiter bevegung. Frankfurt ü/M 1910.
43. E. Dawid. Dwie rozprawki o stosunku socjalizmu do rolnictwa. Lwów. 1904.
44. K. Filipowicz. Parcelacja. Warszawa 1883.
45. E. Abramowski. Idee społeczne, kooperatyzm. W-wa 1907.
46. E. Abramowski. Kooperatywa. Warszawa 1912.
47. M. Tugan-Baranowski. Społeczno-ekonomiczna istota kooperacji. Warszawa 1918.
48. Z. Daszyńska-Golińska. Przez kooperatywy do przyszłego ustroju. Warszawa 1921.
49. J. Dmochowski. Rozwój instytucji społecznych. W-wa 1907.
50. K. Gide. Kooperatywy spożywcze: Warszawa 1907.
51. „ Znaczenie idei solidarności w programie ekonomicznym przyszłości kooperacji.
52. L. Krzywicki. Stowarzyszenia spożywców. Warszawa 1903.
53. Wiadomości statystyczne Gł. Urzędu Statystycznego. Warszawa.
54. Проф. С. А. Первушин. Хозяйственная коньюнктура. Москва, 1925 г.

# СЛОЎНІК

Для большага разуменьня тэрміналёгіі падаём важнейшыя беларускія тэрміны, раўнуючы іх з польскімі і расейскімі тэрмінамі.

| Беларускі тэрмін *) | Польскі або расейскі тэрмін |
|---|---|
| абавязаньне | zobowiązanie, обязательство |
| акордная плата | płaca akordowa |
| бавоўна | bawełna, хлопок |
| бюджэт | budżet, бюджет |
| вартасьць ужытковая (пажытковая) | wartość użytkowa |
| вартасныя паперы | papiery wartościowe |
| вешчаваньне, прадказ | przepowiednia, предсказание |
| вытворства**), прадукцыя, вытворчасьць | wytwórczość, производство |
| вынаходы | wynalazki, изобретения |
| вытвар, прадукт, твор | wytwór, продукт |
| выраб | wyrób |
| вытварыцель, продуцэнт | wytwórca, производитель |
| грамадзкі даход | dochód społeczny |
| грамадзка-неабходны | społecznie niezbędny, общественно-необходимый |
| ўграмадзкаваньне | uspołecznienie, обобществление |
| давер, давяраньне | zaufanie, доверие |
| даршчына, дарэньне | darowizna |
| дасьлед, дасьледаваньне | badanie, исследование |
| дзейнік | czynnik, фактор |
| добрародныя мэталі | metale szlachetne, благородныя мет. |

*) Беларускія тэрміны ня трэба лічыць за аканчальна устаноуленыя, жыцьце пакажа які тэрмін будзе найбольш адпаведны, лектар можа тасаваць той ці іншы тэрмін.

**) Замест „вытворства“ часта спатыкаецца слова „вытвар“, якое трэба разумець як „вытворства“; слова „вытвар“ сапрауды азначае „прадукт“.



| Беларускі тэрмін | Польскі або расейскі тэрмін |
|---|---|
| заказ | zamówienie |
| закладныя лісты | listy zastawowe |
| заработная (заробная) плата | płaca zarobna, заработная плата |
| захопныя тэндэнцыі | tendencje zaborcze |
| зварот, абарот | obrót, оборот |
| крызыс | kryzys, кризис |
| монэта | moneta |
| мена, намен | zamiana, обмен |
| манаполь | monopol |
| мыта | cło, |
| мытная тарыфа | taryfa celna, таможенный тариф |
| неабходны рабочы час | niezbędny czas roboczy, необходимое рабочее время |
| павер, крэдыт | kredyt, кредит |
| паверныя білеты, пазыка | pożyczka, кредитныя билеты |
| папяровыя грошы | pieniądz papierowy |
| посул і патрабаваньне | popyt i podaż, спрос и предложение |
| прадпрыемнік | przedsiębiorca, предприниматель |
| процант | procent |
| прыбытак, зыск | zysk, прибыль |
| прадукцыйнасьць працы | производительность труда |
| прытарнаваць, датарнаваць | zastosować, применить |
| разьмеркаваньне, падзел | podział, распределение |

# ЗЬМЕСТ.


Стар.

Прадмова . . . . . . . . . . . . . . . . . . 3

Уступная часьць.

§ 1. Навука і яе падзел . . . . . . . . . . . . . 5
§ 2. Прадмет эканомікі. . . . . . . . . . . . . . 6
§ 3. Эканамічныя законы. . . . . . . . . . . . . 7
§ 4. Навуковыя мэтоды. . . . . . . . . . . . . . 7
§ 5. Людзкія патрэбы . . . . . . . . . . . . . . 9
§ 6. Гаспадарчае дабро. . . . . . . . . . . . . . 10
§ 7. Вартасьць. . . . . . . . . . . . . . . . . 10
§ 8. Тэорыя вартасьці. . . . . . . . . . . . . . 12
§ 9. Цана. . . . . . . . . . . . . . . . . . . 14
§ 10. „Index numbers“ . . . . . . . . . . . . . 16

1-ая ЧАСЬЦЬ.

Вытворства.

I. Дзейнікі вытворства.

§ 11. Функцыі грамадзкай гаспадаркі. . . . . . . . 18
§ 12. Дзейнікі вытворства. . . . . . . . . . . . . 19

А. Прырода.

§ 13. Прырода, як дзейнік вытворства . . . . . . . 19
§ 14. Закон зьмяншэньня даходу. . . . . . . . . . 21

Б. Праца.

§ 15. Праца, як дзейнік вытворства. . . . . . . . . 22
§ 16. Прадукцыйнасьць працы. . . . . . . . . . . 23

В. Капітал.

§ 17. Капітал, як дзейнік вытворства. . . . . . . . 24
§ 18. Як творыцца капітал? . . . . . . . . . . . . 26

II. Гісторыя Грамадзкай Гаспадаркі.

§ 19. Гаспадарчыя этапы. . . . . . . . . . . . . 26
§ 20. Гісторыя работніцкае клясы. . . . . . . . . . 32





Стар.

III. Лад вытворства.

§ 21. Капіталістычны лад . . . . . . . . . . . . 34
§ 22. Конкурэнцыя. . . . . . . . . . . . . . . . 36
§ 23. Концэнтрацыя вытворства. . . . . . . . . . . 37
§ 24. Эканамічны цыкль. . . . . . . . . . . . . . 38
А. Паняцьце аб крызысах. . . . . . . . . . 38
Б. Прычыны крызысаў . . . . . . . . . . . 41
В. Тэорыі крызысаў . . . . . . . . . . . . 43
§ 25. Земляробскі крызыс . . . . . . . . . . . . 48
А. Зьмяншэньне закупной здольнасьці земляробскіх прадуктаў. . . . . . . . 48
Б. Прычыны зьявішча „ножніцаў“ цэн земляробскіх і прамысловых тавараў. . 52
§ 26. Сындыкаты . . . . . . . . . . . . . . . . 59
§ 27. Коопэратыўнае вытворста. . . . . . . . . . . 61

Статыстычныя даныя:

Табліца 1. Агульнае разьвіцьцё капіталістычнай гаспадаркі. . . . . . . . . . . . . . 62
Табліца 2. Паказальнікі закупной сілы земляробскіх прадуктаў у Польшчы. . . . . . . . . 63
Табліца 3. „Ножніцы“ ў С. С. Р. Р.. . . . . . . . . 64

2-ая ЧАСЬЦЬ.

Зварот.

I. Мена.

§ 28. Гісторыя мены. . . . . . . . . . . . . . . 66
§ 29. Карысьць мены. . . . . . . . . . . . . . . 67
§ 30. Закон посулу і патрабаваньня . . . . . . . . 68

II. Грошы.

§ 31. Гісторыя грошай . . . . . . . . . . . . . . 69
§ 32. Монэта. . . . . . . . . . . . . . . . . . 70
§ 33. Монэтарныя сыстэмы. . . . . . . . . . . . 71
§ 34. Закон Грэшама. . . . . . . . . . . . . . . 73
§ 35. Парытэт. . . . . . . . . . . . . . . . . . 74

III. Папяровыя платныя знакі.

§ 36. Банкноты і папяровыя грошы . . . . . . . . 75
§ 37. Рэформа валюты. . . . . . . . . . . . . . 76
I. Аўстрыя . . . . . . . . . . . . . . .
II. Нямеччына. . . . . . . . . . . . . .
III. С. С. Р. Р. . . . . . . . . . . . . .
IV. Польшча. . . . . . . . . . . . . . .

Стар.

§ 38. Грашовы лад і сусьветная вайна . . . . . . . . 79
§ 39. Эмісыйныя банкі . . . . . . . . . . . . . . . 83
§ 40. Вэксалі. . . . . . . . . . . . . . . . . . . 85
§ 41. Чэкі і пераказы. . . . . . . . . . . . . . . 86
§ 42. Компэнсацыйная палата і біржа . . . . . . . . 86

IV. Павер.

§ 43. Асновы паверу. . . . . . . . . . . . . . . . 88
§ 44. Рожнароднасьць паверу . . . . . . . . . . . 89
§ 45. Установы доўгатэрміновага паверу . . . . . . 90
§ 46. „ кароткатэрміновага паверу . . . . . 91
§ 47. „ рэчавога паверу. . . . . . . . . . 92
§ 48. Коопэратыўныя банкі. . . . . . . . . . . . . 93

V. Гандаль.

§ 49. Эканамічная роля гандлю. . . . . . . . . . . 95
§ 50. Рожнароднасьць гандлю . . . . . . . . . . . 97
§ 51. Гандлёвая палітыка . . . . . . . . . . . . . 98
§ 52. Протэкцыянізм і вольны гандаль . . . . . . . 101
а) Тэорыя мытнай абароны. . . . . . . . 103
б) „ вольнага гандлю. . . . . . . . 104
§ 53. Гандлёвы і платны балянсы. . . . . . . . . . 107

Статыстычныя даныя.

Табліца 4. Залатыя рэзэрвы ў мільёнах даляраў. . . . 111

3-ая ЧАСЬЦЬ.

Разьмеркаваньне.

I. Разьмеркаваньне даходу.

§ 54. Маемасная няроўнасьць. . . . . . . . . . . . 112
§ 55. Даход . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 114
§ 56. Асновы разьмеркаваньня. . . . . . . . . . . 114
§ 57. Непрапарцыянальны ўзрост даходаў. . . . . . 117

II. Даход з уласнасьці.

§ 58. Рэнты . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 118
§ 59. Зямельная рэнта . . . . . . . . . . . . . . 118
§ 60. Чынш. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 121
§ 61. Даход з капіталаў . . . . . . . . . . . . . 122
§ 62. Даход прадпрыемніка . . . . . . . . . . . . 124

III. Даход з працы.

§ 63. Характарыстыка даходаў з працы. . . . . . . 125
§ 64. Спосабы аблічаньня заработнай платы . . . . 129



Стар.

§ 65. Тэорыі заработнай платы . . . . . . . . . . . 130
§ 66. Законы заработнай платы. . . . . . . . . . . 131

IV. Работніцкае пытыньне.

§ 67. Работніцкая кляса. . . . . . . . . . . . . . 133
§ 68. Солідарнась работніцкай клясы. . . . . . . . 134
§ 69. Безрабоцьце . . . . . . . . . . . . . . . . 135
§ 70. Соцыяльнае законадаўства. . . . . . . . . . 137
§ 71. Прафэсіянальныя саюзы . . . . . . . . . . . 138

4-ая ЧАСЬЦЬ.

Гісторыя грамадзкай гаспадаркі.

I. Эканамічныя доктрыны.

§ 72. Старадаўнасьць. . . . . . . . . . . . . . . 141
§ 73. Сярэднія вякі . . . . . . . . . . . . . . . 142

II. Эканамічныя школы.

Новыя часы.

§ 74. Мэркантылізм . . . . . . . . . . . . . . . . 144
§ 75. Школа фізыякратаў. . . . . . . . . . . . . . 147
§ 76. Лібэральная школа . . . . . . . . . . . . . 148
§ 77. Манчэстэрская школа . . . . . . . . . . . . 151
§ 78. Нацыянальная школа. . . . . . . . . . . . . 151
§ 79. Псыхолёгічная або Аўстрыяцкая школа . . . . 153
§ 80. Матэматычная школа. . . . . . . . . . . . . 154
§ 81. Соцыялізм . . . . . . . . . . . . . . . . . 156
а) Рацыянальны соцыялізм. . . . . . . .
б) Навуковы соцыялізм . . . . . . . . .
в) Аграрны соцыялізм. . . . . . . . . .
г) Рэвізіянізм. . . . . . . . . . . . .
§ 82. Грамадзкі солідарызм. . . . . . . . . . . . 167
а) Коопэратывізм. . . . . . . . . . . . 168

Статыстычныя даныя Беларусі:

Табліца 5. Тэрыторыя этнографічнае Беларусі і яе насяленьне ў апошнія годы (1916—1919). . 171
Літэратура. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 174
Слоўнік . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 176
Друкарскія абмылкі . . . . . . . . . . . . . . . . 178